Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гарксму Камуністычнай партыі (б) Беларусі

Год выданьня—XV
№ 122 (4026)
СУБОТА, 9 МАЯ
1931 г.
Коштуе нумару 5 кап.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫНКА

7 калгасаў высунулі сустрэчны плян сяўбы

ШКЛОЎ. (НАШ КАР.).

ЗА АПОШНЮЮ ДЭКАДУ Ў КАЛГАСІ РАЕНУ ЎСТУПІЛА 175 БЯДНЯКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК. ПА ЗЯДЗЕЛЬШЧЫНУ ПЕРАЙШЛІ ДАДАТКОВА 22 КАЛГАСЫ. 7 КАЛГАСАЎ ВЫСУНУЛІ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН СЯЎБЫ.

РАЙКОМ ПАРТЫІ НАКІРАВАЎ УВЕСЬ АКТЫЎ РАЕНУ Ў СЕЛЬСАВЕТЫ ДЛЯ РАСПРАЦОЎКІ ПАСТАНОЎ VI ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ І ЎЗМАЦНЕНЬНЯ ТЭМПАЎ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

ЯН.

З нормамі выпрацоўкі--у поле

ЧАЧЭРСК

Калгас «РОСКВІТ» 27-га красавіка прыступіў да сяўбы. За два дні калгасам засеяна 15 гэкт. канюшыны, 2 гэкт. бульбы, 6 гэкт. ячменю і 1,5 гэкт. капуснай рассады. Калгасам выпрацаваны дасканалы вытворчы плян.

Цягавай сілай калгас забясьпечан. Рабочая сіла разьбіта на брыгады. Нормы выпрацоўкі даведзены да калгасьнікаў

АЎСЕЕНКА.

Сяўба ў прыгарадных гаспадарках не забясьпечана

Прыгарадныя гаспадаркі закліканы адыграць адказьнейшую ролю ў справе пашырэньня харчовай базы краіны, адшуканьня дадатковых крыніц паліпшэньня рабочага забясьпячэньня.

Радам пастаноў партыйных і ўрадавых органаў разьвіцьцё прыгарадных гаспадарак пастаўлена, як баявая задача партыйных і гаспадарчых арганізацый, як першачарговае пытаньне сёньняшняга дня.

Студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове па справаздачным дакладзе Белкаапсаюзу вызначыў праграму разьвіцьця прыгарадных гаспадарак, даў шы сыстэме спажывецкай кааперацыі заданьне — давесьці разьмеры зямельнай плошчы пад прыгарадныя гаспадаркамі да 25 тысяч гэкт., з іх 5.600 га пад агароды, па парнікоўай гаспадарцы забясьпечыць 50 тыс. рам, давесьці мапочнае стада да 12 тыс. штук, адкорм сьвіней — 60 тыс. штук. На выкананьне гэтых адказьнейшых заданьняў спажывецкая кааперацыя павінна была зьвярнуць галоўную сваю ўвагу.

Прыгарадныя гаспадаркі зараз уступілі ў адказьнейшы пэрыяд свайго разьвіцьця — у паласу сяўбы. Ад выкананьня пасеўных і пасадачных плянаў у большай ступені будзе залежаць ажыцьцяўленьне ЎСІХ ВЫТВОРЧЫХ ПРАГРАМ, рэалізацыя пастаноў партыі і ўраду.

Між тым, мы вымушаны канстатаваць, што прыгарадныя гаспадаркі падыйшлі да сяўбы НЕПАДРЫХТАВАНЫМІ, што тое становішча, якое мы зараз маем, стварае сур'ёзную пагрозу буйнейшых прарываў.

Ня гледзячы на рад катэгарычных дырэктыў цэнтральных партыйных і савецкіх органаў аб сваячасовым адводзе зямель пад прыгарадныя гаспадаркі, апошнія яшчэ і да гэтага часу НЕ ЗАБЯСЬПЕЧАНЫ ЗЯМЕЛЬНЫМІ ФОНДАМІ ў разьмерах, што забясьпечвалі-б выкананьне кантрольных заданьняў. У цэлым радзе выпадкаў якасьць зямель вельмі нізкая і не адпавядае патрабаваньням гаспадарак. Асабліва востра стаіць пытаньне з плошчай пад агародныя культуры. Работы па зямляўпарадкаваньні поўнасьцю не завершаны.

Ня лепшае становішча з забесьпячэньнем прыгарадных гаспадарак РАБОЧАЙ СІЛАЙ — на 17 проц. пасэзоннай і 72 проц. пастаяннай. Вярбоўка як па лініі Белкаапсаюзу, так і НК працы і прафарганізацыі праходзіць нездавальняюча.

Патрэбны самыя рашучыя меры па адшуканьні для рабочых гаспадарак ЖЫЛОЙ ПЛОШЧЫ шляхам неадкладнага выкананьня Белдзяржбудам работ па сканачэньні будаўніцтва бараканў, а таксама шляхам максымальнага прыстасаваньня ў якасьці часовых інтэрнатаў памяшканьняў, якія прылягаюць да гаспадарак і знаходзяцца на акраінах гарадоў.

Невыкананьне Белкаапсаюзам плянаў куплі коняй стварае для прыгарадных гаспадарак напружанае становішча з ЦЯГАВАЙ СІЛАЙ, якое яшчэ больш ускладняецца тым, што распарадзьненьне цэнтральных органаў аб прадастаўленьні прыгарадным гаспадаркам 55 трактараў тэрмінам на 20 дзён у радзе раёнаў (Лёзна, Гарадок і інш.) сустракае процідзеяньне з боку мясцовых органаў. Белкаапсаюз і Трактарасцэнтр павінны неадкладна ўжыць усе меры да поўнага ўкамплектаваньня гаспадарак цягавай сілай як жывой, так і мэханічнай.

У важнейшым пытаньні пасеўнай кампаніі—забесьпячэньні НАСЕННЫМ МАТАР'ЯЛАМ — ёсьць буйнейшыя недахопы. Нераспарадчасьць прывяла да таго, што пры пішках гароднага насеньня, па бульбе, аўсе, віцы і канюшыне адчуваецца самы востры недахват. Патрэбны рашучыя, тэрміновыя меры з боку БКС і НКЗ па неадкладнай перадачы пішкаў гароднага насеньня іншым сыстэмам і поўным забесьпячэньні нехапаючых гатункаў.

Зусім нездавальняючае становішча наглядаецца З ВЫВАЗАМ І ЗАВОЗАМ УГНАЕНЬНЯЎ, пляны чаго выкананы па асобных мясцох ад 25 да 50 проц. Сур'ёзны прарыў, які стварыўся ў гэтай галіне, можа быць ліквідаваны толькі шляхам неадкладнай і поўнай мабілізацыі ня толькі конскага складу і абозу прыгарадных гаспадарак, але і прыцягненьня да гэтай работы аўтатранспарту і гужавой сілы гарадоў, да якіх прылягаюць гаспадаркі.

Нельга прайсьці міма таго, што пляны ЗАКЛАДКІ ПАРНІКОЎ фактычна сарваны як па колькасьці рам, так і тэрміне. Бліжэйшыя НЯМНОГІЯ дні павінны быць усямерна выкарыстаны для максымальнага скарыстаньня парнікоў для выгаркі раньняй гародніны, для таго, каб, наколькі магчыма, нагнаць прапушчанае.

Усе перэчыныя зьявішчы адбываюцца ў прыгарадных гаспадарках на фоне агідных недахопаў у галіне АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ, парушэньня элемэнтарных норм рацыянальнага гаспадараньня. У БКС і ЦРК АДСУТНІЧАЮЦЬ ПРАМФІНПЛЯНЫ па прыгарадных гаспадарках. Фінансаваньне пасеўнай кампаніі праходзіць яўна нездавальняюча. У большасьці гаспадарак НЯМА ЯШЧЭ РАБОЧЫХ ПЛЯНАЎ, правіл унутранога распарадку, разьмеркаваньня абавязкаў, норм выпрацоўкі і г. д.

ПРЫНЦЫПЫ ГАСПАДАРЧАГА РАЗРАХУНКУ НЕ ПРАСЯКНУЛІ Ў ПРЫГАРАДНЫЯ ГАСПАРКІ. Абязьлічка, адсутнасьць зьдзельшчыны, адсюль спавал прадукцыйнасьць працы, безгаспадарчасьць — усё гэта моцна б'е, тармозіць у значнай ступені выкананьне вытворчых праграм.

З такім сумным балянсам па прыгарадных гаспадарках падыходзіць спажывецкая кааперацыя да весьнавой сяўбы.

Дзе хаваюцца карэньні гэтых глыбокіх прарываў?

Перш за ўсё ў ВЕЛЬМІ СЛАБЫМ КІРАЎНІЦТВЕ ПАДРЫХТОЎКАЙ ДА СЯЎБЫ З БОКУ БЕЛКААПСАЮЗУ. Чым можна апраўдаць такое недапушчальнае становішча, што за апошнія ТЫДНІ праўленьне БКС нават не абмеркавала пытаньня аб ходзе падрыхтоўкі да сяўбы прыгарадных гаспадарак? Чым можна апраўдаць, што БКС не арганізаваў апэрацыйнай справаздачнасьці па ходзе сяўбы? Як можна кіраваць, ня ведаючы, што робіцца на мясцох? Як можна гаспадарыць, ня маючы нават прамфінплянаў?

Працаваць так — значыць ісьці ўсьляпую.

БУЙНЕЙШЫЯ НЕДАХОПЫ ЁСЬЦЬ ЯШЧЭ І Ў РАБОЦЕ САМІХ ЦРК. Апартуністычная бязьдзейнасьць, коснасьць, кансэрватызм, бездапаможнае таптаньне намесцы усё гэта ў вялікаў ступені характарызуе кіраўніцтва прыгарадным гаспадаркамі з боку раду ЦРК. Тая ўвага, якую аддае ЦРК прыгарадным гаспадаркам, далёка яшчэ не адпавядае задачам, пастаўленым у гэтай галіне партыяй і ўрадам.

З другога боку, нельга не адзначыць, што ва многіх выпадках прыгарадныя гаспадаркі не сустракаюць належнага ПАДТРЫМАНЬНЯ І ДАПАМОГІ З БОКУ МЯСЦОВЫХ ПАРТЫЙНЫХ, САВЕЦКІХ, ПРАФЭСЫЯНАЛЬНЫХ І ГАСПАДАРЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ. Недаацэнка ролі прыгарадных гаспадарак мае не паасобнае месца. Камісіі садзейнасьці прыгарадным гаспадаркам пры гарсаветах у абсалютнай большасьці бязьдзейнічаюць. Можна з гэтага выдзеліць толькі Віцебск, дзе гарсавецкай камісіяй праведзена вялікая работа.

Практычны ўдзел прафсаюзаў і камсамолу яўна невыстарчальны. Рабочыя масы прадпрыемстваў яшчэ ня прыцягнуты да ўдзелу ў выходных дні ў работах прыгарадных гаспадарак. Масавы кантроль адсутнічае. Слабая растлумачальная работа ў сувязі з рэалізацыяй МЭТАВЫХ УЗНОСАЎ на ўзмацненьне прыгарадных гаспадарак. Вельмі востра стаіць да гэтага часу ПЫТАНЬНЕ З КАДРАМІ, у прыватнасьці з адміністрацыйна-тэхнічным і рахункаводным пэрсаналам.

Работа нізавых ПАРТЫЙНЫХ І ПРАФСАЮЗНЫХ ОРГАНАЎ, асабліва рабачкомаў, у прыгарадных гаспадарках мае буйныя недахопы. Кіраўніцтва заспаборніцтвам, ударніцтвам, барацьбой з абязьлічкай часта невыстарчальна канкрэтнае, адэкватнае ад вытворчых задач прыгарадных саўгасаў.

Падобнае становішча нецярпіма і патрабуе рашучага ўзмацненьня ўвагі ўсёй савецкай грамадзкасьці будаўніцтву прыгарадных гаспадарак.

Ганебныя прарывы з падрыхтоўкай да сяўбы з усёй выразнасьцю сьведчаць, што спажывецкая кааперацыя ва многіх сваіх зьвяньнях яшчэ не змагла перабудавацца ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі трэцяга году пяцігодкі, ня здолела ўзяць патрэбных тэмпаў работы.

ТРЭБА ПРОСТА І ЯСНА ПАСТАВІЦЬ ПЫТАНЬНЕ, ШТО СЯЎБА Ў ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРКАХ — БАЯВЫ ЭКЗАМЕН ДЛЯ СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЭРАЦЫІ, ПРАВЕРКА ЯЕ ЗДОЛЬНАСЬЦЯЙ ЗМАГАЦЦА ЗА ПРАВЯДЗЕНЬНЕ Ў ЖЫЦЬЦЁ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ.

Трэба неадкладна выраўнаць фронт, кінуць сілы на ліквідацыю прарываў, прыцягнуць фабрыкі і заводы да пытаньняў сяўбы, забясьпечыць іх практычную дапамогу, узяць выкананьне плянаў пад штодзенны кантроль рабочых мас.

Цьвёрдае партыйнае кіраўніцтва, жорсткая барацьба з апартуністычнымі элемэнтамі, мабілізацыя пралетарскай грамадзкасьці, дзелавая дапамога саветаў, прафсаюзаў, камсамолу забясьпечыць патрэбны перапом.

Пляны сяўбы ў прыгарадных гаспадарках ПАВІННЫ І БУДУЦЬ поўнасьцю выкананы ва што-б там ні стала.

16 дзён засталося да другога тыражу пазыкі „Пяцігодка“

25 мая ў Макеёўцы адбудзецца другі тыраж пазыкі «Пяцігодка—за 4 гады». Да гэтага тыражу мы павінны прыйсьці з поўнай рэалізацыяй пазыкі. На 20 красавіка плян выканан на 98,1 проц., прычым падпіска сярод рабочых і служачых дасягае 106,7 проц. кантрольных лічбаў, але вёска моцна адстала.

У пляне мабілізацыі сродкаў у другім квартале наступленьні на пазыцы складаюць амаль 50 проц. Гэтым вызначаецца вялізарнае значэньне пазыковай работы і вялікія задачы, якія стаяць перад камсадамі. Калі посьпех усякай мабілізацыі гаспадарчай кампаніі залежыць ад разгорнутай палітычна-растлумачальнай работы, то ў рэалізацыі пазыкі асабліва значэньне набывае яшчэ і добра пастаўленае абслугоўваньне пазыкатрымальнікаў.

Зрозумела, выплата выйгрышаў, нават хуткая, калі ёй ня будзе наданы масавы характар, яшчэ не вырашае пытаньня. Добра робяць тыя прадпрыемствы, якія наладжваюць спэцыяльныя ўрачыстыя вечары выплаты выйгрышаў. Ня больш паказана, што гэта зьяўляецца найлепшай формай агітацыі за пазыку. Такія вечары звычайна даюць новую вельмі значную падпіску. Пры гэтых умовах кожны выйгрыш становіцца дзейсным фактарам, і кожны выйгрыш—актыўным агітатарам за пазыку. На жаль, гэты мэтад ўжываецца дадзёна ня ўсюды.

Значна горш у гэтых адносінах у вёсцы. Тут на дапамогу павінны прыйсьці горад, у прыватнасьці—шэфы. Неадкладнае разгортваньне работы ў гэтым напрамку безумоўна дасьць адчувальныя рэзультаты.

Дрэнна абслугоўваным застаецца яшчэ такі вучастак, як сэзонныя. Будаўніцтва ўжо разгарнулася, а фінпасава-крэдытныя органы і прафсаюзы ўсё яшчэ разварушваюцца. Безумоўна, што добра распаўленая работа камісій садзейнасьці і тут дасьць хуткія рэзультаты.

Нарэшце, трэба ўпарадкаваць паступленьне сродкаў на пазыцы ў Дзяржбанк. Красавіковы плян паступленьняў выкананы на Саюзе да 20 красавіка толькі на 21 проц. Сродкі гэтыя загрузаюць ва ўсіх каналах, пачынаючы ад сяла і канчаючы вобласьцю. Зусім відавочна, што такая недысцыплінаванасьць вядзе да перабояў у фінансаваньні народнай гаспадаркі і ня можа быць цярпіма.

Да другога тыражу засталося 16 дзён—тэрмін зусім дастатковы для таго, каб разгарнуць баявую кампанію вакол рэалізацыі пазыкі.

Вялізарная афёра румынскай ваеншчыны

ВЕНА, 3. Паводле паведамленьня з Бухарэсту генэрал Стефанэску пачаў сьледзтва па справе аб субсыдыі, якую атрымлівала ад дзяржавы таварыства «Фэро-Хэмік». Гэта таварыства было створана ў 1924 годзе лібэральным урадам. На працягу апошніх 7 год яно атдам. На працягу апошніх 7 год яно атрымала вялізарныя субсыдыі ад дзяржавы за зьнішчэньне няпрыгодных ваенных матар'ялаў, за рамонт пастарэлых гармат і за выраб выбухопых матэрыял. Аднак, таварыства займалася тым, што дастаўляла прызначаныя да зьнішчэньня ваенныя матар'ялы румынскай армі ў якасьці новых вырабаў.

Такім чынам, таварыства, на чале якога стаяла некалькі генэралаў, палкоўнікаў, а таксама палітыкаў лібэральнай партыі і нацыянал-царанісцкай партыі, атрымлівала фантастычныя даходы. Страты, прычыненыя дзяржаве, дасягаюць 18 мільярдаў лей, г. зн. у 3 разы перавышаюць тую суму, якую ўрад Міранэску нядаўна атрымаў у Парыжы ў выглядзе замежнай пазыкі.

Прадбачыцца буйны працэс, у якім у якасьці абвінавачаных будуць фігураваць вышэйшыя ваенныя чыны і палітыкі. Урад Іорґі мае на ўвазе выкарыстаць гэты працэс у мэтах перадвыбарчай агітацыі.

Лютуе белы тэрор на акупаванай Зах. Беларусі

Зацьвярджэньне шматгадовага катаржнага прысуду над б. паслами „Змаганьня“

ТУРМЫ І АРЫШТНЫЯ ДАМЫ ПЕРАПОЎНЕНЫ

Суровая расправа польскага фашызму

ВІЛЬНЯ, 8. Задушэньне нацыянал-вызваленчага руху ў Зах. Беларусі, якое праводзіцца фашысцкімі акупантамі пры дзейнай дапамозе беларускіх нацфашыстаў Астроўскіх, Луцкевічаў і К° завастраецца з кожным днём. Фашысцкія суды настолькі загружаны палітычнымі працэсамі, што змушаны за адзін дзень раглядаць па 3-4 справы, сыплючы за найменшае праяўленьне барацьбы з фашызмам «стандартныя» прыгавары па 8-12 год катаржных работ.

14-га студзеня бягучага году ў Віленскім акруговым судзе слухалася справа былых паслоў беларускага рабоча-сялянскага пасольства клюбу «Змаганьня»: **І. Гаўрыліка, І. Дварчаніна, Р. Крынчына і Ф. Валынца**, а таксама працаўнікоў Цэнтральнага Сакратарыяту пры гэтым клюбе—**С. Жыткевіча, І. Місько, Н. Астапчыка і Пяткуна.** Як вядома, усё абвінавачаньне было змайстравана паліцыяй і дафэзывай. Суд прыгаварыў тады 4 паслоў **па 8 год**, а ўсіх іншых—**па 4 гады катаржнай турмы кожнага.**

Орган віленскіх манархістаў «Слово» ад 6-га мая паведамляе, што гэтымі днямі ў апэляцыйным судзе ў Вільні разглядалася зноў гэта справа. **Фашысцкі суд катаржны прыгавор акруговага суда зацьвердзіў.**

900 тысяч дзяцей па-за школаю

(Ліст, атрыманы на мове эспэранта)

У фашысцкай Польшчы цяпер не паведзае пачатковую школу 900 тыс. дзяцей, гэта значыць 26 проц. усіх дзяцей, якія паводле закону павінны наведваць школу. Прычынай гэтаму зьяўляецца **недахват будынкаў і настаўнікаў.** Ёсьць шмат кваліфікаваных настаўнікаў, але... беспрацоўных. **У Зах. Украіне, акупаванай Польшчай, не наведваюць школу 78 проц. дзяцей школьнага ўзросту.** 44 проц. усіх пачатковых школ—гэта школы найбольш дрэнна абсталяваныя, тыпу «аднаклясных»—і такой і 1 настаўнік.

Зацьвярджаны большасьцю дэпутатаў Пілсудзкага, «выбраных» пры дапамозе тэрору і фальсыфікацыі выбараў, **будзят зьмяншае выдаткі на асьвету на 36 млн. злотых.** Для пабудовы новых патрэбных школ у бюджэце вызначан толькі **1 млн. злотых** у той час, як паводле нават афіцыяльных даных для гэтай мэты патрэбна **5 млдр. злотых.** Гэта значыць, што калі на будзе зьмэн бюджэт, дык для пабудовы патрэбнай колькасьці школ трэба будзе **5.000 год.**

У бюджэце фашысцкай Польшчы «ня ма грошай» для таго, каб напаць настаўнікаў для пачатковых школ, **затое мільярды на падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць СССР ёсьць.** Таксама не скарачаецца бюджэт і паліцыі.

Беспрацоўе ў Польшчы дасягае жудасных разьмераў, але, ня кледзячы на гэта, з дзяцей беспрацоўных, як і з іншых, штомесячна выцягваюць па 1-2 злотых на падручнікі (паводле польскай канстытуцыі школы зьяўляюцца бясплатнымі). Дзеці павінны купляць розныя мэдалі, жэтоны «нацыянальнага флёту» з партрэтамі Пілсудзкага, іх прымушаюць плаціць узносы ў «Польскі саюз на барацьбе з сухотамі», «для польскай школы за мяжой»..

Якую-ж асьвету дае польская школа? Бацькі гэтых дзяцей, якіх капіталісты эксплёатуюць да апошняй магчымасьці, выціскаюць з іх апошнія сокі, чуюць ад сваіх дзяцей, што «вельмі трэба любіць бацькаўшчыну», «кожны павінен любіць бога» (рэлігія займае першае месца ў школе). Дзеці расказваюць бацькам, што яны зьяўляюцца членамі «школьнага гуртка маткі боскай». Кожную нядзелю дзеці павінны пад кіраўніцтвам настаўніка хадзіць у касьцёл. Для таго, каб «узбудзіць прыхільнасьць» дзяцей да розных рэлігійных школьных таварыстваў, членам гэтых таварыстваў у Варшаве даюць бясплатныя білеты ў дзіцячыя тэатры.

Зараз на аднаго настаўніка ў Польшчы прыпадае звыш 60 вучняў (з прычыны «крызысу»), у большасьці школ заняткі адбываюцца ў дзьве зьмены.

Настаўнік.

* * *

Гэты ліст дае аж надта выразны малюнак становішча пачатковай-школьнай асьветы ў фашысцкай Польшчы. Капля мільёна дзяцей школьнага ўзросту застаецца па-за школай, застаецца, не гаворачы ўжо пра самую элемэнтарную асьвету,—нават зусім няпісьменнай. У польскага фашызму мільярды на падрыхтоўку ўзброенага нападу на Савецкі Саюз, мільёны на ўтрыманьне паліцыі, шпіёў, сеткі дэфэнзывы, якою як павуціньнем аблытана ўся Зах. Беларусь і Зах. Украіна,—на гэта сродкі ёсьць, але на наём настаўнікаў, на пабудову школьных будынкаў—сродкаў няма. Ды гэта зусім зразумелая рэч. Не ў інтэрэсах польскага фашызму асьвета шырокіх працоўных мас, бо тады тэтыя масы ня былі-б для яго паслухмяным гарматным мясам. Зразумела, што сотні тысяч дзяцей, якія засталіся па-за школай, зьяўляюцца дзецьмі не кіруючых клясаў, а ДЗЕЦЬМІ ПЕРАВАЖНА ГАРАДЗКОЙ І ВЯСКОВАЙ БЕДНАТЫ, ДЗЕЦЬМІ ПРАЛЕТАРАЎ.

Ня лепшы лёс і тых дзяцей, якім удалося папасьці ў фашысцкую школу. Як мы бачым з ліста, УСЯ ШКОЛЬНАЯ АСЬВЕТА НАКІРАВАНА ДА ТАГО, КАБ АТРУЦІЦЬ РОЗУМ ДЗІЦЯЦІ РЭЛІГІЙНАЙ АТРУТАЙ, ВЫБІЦЬ З ЯГО ПАЧУЦЬПЕ ГОДНАСЬЦІ ЧАЛАВЕКА З МЭТАЙ ВЫХАВАЦЬ З ДЗІЦЯЦІ РАБА КАПІТАЛУ, ПАСЛУХМЯНАЕ ГАРМАТНАЕ МЯСА.

Падпісаньне савецка-літоўскага пратаколу ўмацоўвае мір на Ўсходняй Эўропе

Інтэрвію паўпрэда СССР тав. Карскага замежным журналістам

КАЎНАС (Коўна), 7. У Савецкім паўпамоцным прадстаўніцтве адбыўся прыём журналістаў. Прысутнічалі рэдактары штодзённых і буйнейшых штотыдзённікаў, а таксама замежныя карэспандэнты.

Паўпамоцны прадстаўнік СССР т. Карскі даў інтэрв'ю, у якім асьвятліў значэньне падпісанага 6 мая савецка-літоўскага пратаколу. Спыніўшыся на савецка-літоўскім дагаворы 1926 г., тав. Карскі заявіў:

«Зараз няма патрэбны даказваць значэньне гэтага дагавору. Падпісаны пратакол зьяўляецца яркім довадам таго, што дагавор 1926 г. цалкам і поўнасьцю сябе апраўдаў. Адносіны паміж абедзьвюма дзяржавамі, заснаванымі на дагаварох 1920 г. і 1926 г., нязьменна разьвіваюцца на пачатках шчырай прыязьні. Я выказваю ўпэўненасьць, што гэтыя адносіны будуць і надалей разьвівацца ў тым-жа напрамку, які не зьяўляецца выпадковым, а выплывае з асноўных прынцыпаў палітыкі абедзьвюх дзяржаў. Надпісаньне пратаколу сьведчыць аб наўпасьці паміж СССР і Літвой такіх адносін, пры якіх можа лічыцца забясьпечаным далейшае пашырэньне эканамічных і культурных зносін у духу прыязнага супрацоўніцтва. Я хачу падкрэсьліць зьмест пратаколу з пункту погляду ўмацаваньня міру. Адносіны паміж СССР і Літвой заўсёды былі важным фактарам міру на гэтым неспакойным вучастку Эўропы. Прыемна адзначыць падпісаньне акту міру і прыязьні ў сучасны момант, калі міжнародная абстаноўка досыць напружаная і шмат сіл пагражае незалежнасьці і вольнаму разьвіцьцю народаў. Я выказваю надзею, што падпісаны ўчора пратакол будзе з задавальненьнем спатканы ўсімі прыхільнікамі міру» (ТАСС).

Антысавецкія махінацыі „пан-эўрапэйскіх“ заправіл

„Цікавая гісторыя“ з запрашэньнем СССР і Турцыі

РЫМ, 6. «Лаваро Фашыста» пад загалоўкам: «Цікавая гісторыя з запрашэньнем СССР і Турцыі» зьмяшчае поўны зьмест адказу Думонда на ноту тав. Літвінава. У каментарах газэта піша, што **на мінулым тыдні рад газэт атрымалі з Жэневы паведамленьне аб зусім другім зьмесьце адказу, у якім у асноўным прызнаваліся правільнымі заўвагамі Масквы і Анкары адносна старонасьці, праўленай пры запрашэньні прымаць удзел у майскай сэсіі пан-эўпаўскай камісіі.** Цяпер-жа,—піша далей газэта, — надаецца зусім другі зьмест адказу, які поўнасьцю пацьвярджае вядомыя **тэзісы залежнага ад Францыі блёку эўрапэйскіх дзяржаў**

«Як-жа магло стацца, — пытаецца «Лаваро Фашыста», — што Ліга Нацый не абвергла апублікаванага на мінулым тыдні зьместу адказу, калі ён быў вымыслам. **Хто-ж тады ўмяшаўся і хто затрымаў адпраўку першага адказу ў Маскву,** і што гэта такое — выпадковасьць ці **закулісная інтрыга?».**

Газэта падкрэсьлівае, што гэта набывае вялікае значэньне, бо датычыць СССР і Турцыі, удзел якіх у Жэневе зьяўляецца ўмовай жыцьця і дзейнасьці пан-эўрапэйскага камітэту.

У заключэньні «Лаваро Фашыста» напамінае, што ў каментарах адносна першага паведамленьня аб адказе Думонда на ноту тав. Літвінава газэта заявіла, што гэты адказ поўны здаровага сэнсу, лёгкі і палітычнай мэтазгоднасьці. Цяпер-жа аказваецца, — канстатуе газэта, — што лёгкі, здаровасьцю сэнсу і палітычнай мэтазгоднасьці няма чаго рабіць **у штучнай брыянаўскай пан-эўрапэйскай камбінацыі.**

Афіцэры 4-х палкоў Польшчы едуць у Румынію

ВАРШАВА, 7. З Варшавы выехала ў Румынію дэлегацыя афіцэраў 4-х пяхотных палкоў на ўрачыстасьці, зьвязаныя з стагодзьдзем існаваньня 4-х пяхотных палкоў румынскай армії. Польскія афіцэры прабудуць у Румыніі да 12 мая. Друк, гаворачы аб візыце, называе яго новай «маніфэстацыяй» польска-румынскай прыязьні.

Забастоўка 15 тэкстыльных фабрык у Польшчы

ВАРШАВА, 8. Наступленьне польскіх капіталістаў на жыцьцёвы ўзровень рабочай клясы мае характар сыстэматычнай зьверху ўплянаванай кампаніі. Па ўсіх галінах прамысловасьці, як **у мэталюргічнай, тэкстыльнай і горна-прамысловай,** адбываюцца значныя зьніжэньні зарплаты і павялічэньне рабочага дня. Сацыял-фашысцкі «Роботнік» 7-га мая паведамляе **аб 20 проц. зьніжэньні зарплаты,** якое абвясьцілі будаўнічыя прамыслоўцы **Лодзі і Верхняй Сілезіі.**

Такія самыя зьніжэньні зарплаты праводзяць прамыслоўцы Дамброўскага вугольнага басэйну і тэкстыльныя фабрыканты Бельскай акругі.

Гэтае жорсткае наступленьне капіталу праводзіцца пры **дапамозе польскіх сацыял-фашыстаў,** якія, выконваючы сацыяльны заказ сваіх гаспадароў, ламаюць забастоўкі шляхам фашысцкіх арбітражаў.

Але імкненьне капіталістаў і сацыял-фашыстаў коштам рабочай клясы выратаваць з няўхільнай руіны капіталістычную гаспадарку разьбіваецца абрашучы адпор, які дае рабочая клясa. У адказ на наступленьне капіталу пачынаюць масава пашыравацца забастоўкі. **4-га мая ў Бельскай акрузе забаставалі рабочыя 15 тэкстыльных фабрык.** Забастоўка выбухнула з прычыны абнавіцца і зьмякчэньня беспрацоўя, якія значна пагоршаюць становішча рабочых. Пяць фабрык, якія яшчэ не прыступілі да забастоўкі, распачынаюць **яе з 9-га мая. Забастоўка носіць востры і напружаны характар.**

Масавыя банкруцтвы прадпрыемстваў

ВАРШАВА. Паглыбленьне эканамічнага крызісу ў фашысцкай Польшчы ідзе надзвычай шпаркімі тэмпамі. Урадавыя фашысцкія колы, а таксама іх сацыял-фашысцкія лёкаі з пенярплівасьцю чакалі веснавога сэзону, спадзяючыся напраўленьня эканамічнага становішча і зьмякчэньня беспрацоўя, якія жорстка б'юць на панаваньні фашысцкай дыктатуры.

Кожны год звыш 250-300 тысяч беспрацоўных выяжджала на веснавыя работы ў Нямеччыну, але сёньня яна таксама перажывае востры эканамічны крызіс і там, таксама як у Польшчы, мільёны беспрацоўных блукаюць па гарадох і вёсках у надзеі адшукваць кавалак хлеба і працу.

Паводле ўрадавых афіцыяльных даных агульная колькасьць беспрацоўных у Польшчы на 25 красавіка складала **362.843** чал., а значыць на **78.781** больш, чым у гэты-ж самы час мінулага году.

Трэба адзначыць, што частковае зьмяншэньне беспрацоўя наступіла ў сувязі з прыходам вясны і закранула толькі зямляробчыя акругі. Што датычыць прамысловых акруг, дык там беспрацоўе ўсюды расьце; пры гетым тэмп гэтага росту ўзмацняецца з кожным днём з прычыны масавых банкруцтваў прамысловых прадпрыемстваў.

Орган фашыстаў-эндэкаў **«Газэта Варшаўска»** з 5 мая паведамляе аб тым, што за апошнія дні напярэдадні крах наступныя варшаўскія фірмы: «Млыны і прамыслова-збожжавыя прадпрыемствы—акцыянэрнае таварыства, раней К. Міхлер», інж. С. Гостынскі і К° «Муліплекс» фабрыка фанэры ў Самушыне, А. Альтэрвэйн—склад шкла і фарфару, гандлёвы дом І. Кулік. Грун і К°, прадпрыемствы «Паленія».

Паводле даных прамысловага аддзелу за адзін толькі красавік **пацярпела крах звыш 50 прадпрыемстваў,** прычым трэба адзначыць, што банкрутцы пернянць фабрыкі, **якія існуюць дзесяткі год** і ў якіх працуюць тысячы рабочых.

Волгабуд— буйнейшая ў сьвеце гідрапабудова

МАСКВА. Мысль аб пабудове на рацэ Волзе ў раёне Самары магутнай гідра-электрычнай станцыі, энэргія якое магла-б быць скарыстана ў прамысловых мэтах і ў мэтах палянпшэньня суднаходства на Волзе, узьнікла яшчэ ў дарэвалюцыйны час.

Толькі савецкая ўлада ўзялася за рэалізацыю гэтай ідэі і паставіла яе на практычныя рэйкі.

Волгабуд вырашана пабудаваць каля Самарскай лукі, якая абрысоўваецца высокімі скалістымі Жыгулёўскімі гарамі. Тут будзе пабудавана гідра-электрычная станцыя коштам паводле папярэдніх падлікаў, у **800 мільёнаў рублёў** з гадавой выпрацоўкай **звыш 8 мільярдаў кілёват-гадзін** у год, што ў **4 разы больш выпрацоўкі ўсіх электрастанцый агульнага карыстаньня Японіі і Італіі ў 1927 годзе.**

На базе энэргіі Волгабуду створацца прадпрыемствы, электра-хэмічнай і электра-мэталюргічнай прамысловасьці, бо акружаюць раён багаты высокагатункавымі вапнякамі, гарачымі сланцамі, фасфарытамі і інш. Энэргія Богабуду будзе скарыстана для электрыфікацыі чыгунак раёну і аб'яднаньня засушлівага Заволжа.

Асаблівае значэньне будзе мець Волгабуд для волжскага суднаходзтва. Канал, які будуецца, скароціць шлях волжскага транзіту на 125 клм., а сыстэма плацін і шлюзаў, якая рэгулюе гадавы сток вады, дасьць павышэньне транзітных глыбінь Волгі ад Казані да Астрахані на 1½ мэтры звыш мінімальнай глыбіні 2,8 мэтра у цяперашні час.

Калі параўнаць наогул гадавую работу будучага Волгабуду з работай людзей, то яго **энэргія заменіць работу 120 мільёнаў рабочых у год.**

У цяперашні час праблема Волгабуду дакладна і ўсебакова вывучаецца, дасьледуецца, для чаго прыцягнуты і выдатныя замежныя спэцыялісты.

У раёне намечанага будаўніцтва пачаліся дасьледы (ТАСС).

ПОЛЬСКІ ФАШЫСТ: няма часу ратаваць насельніцтва ад паводкі, заняты сьпешнымі справамі

Інтэрвэнты за „работай“

Шалёная антысавецкая кампанія фінляндзкага фашызму

СТАКГОЛЬМ, 29. З пэўнай крыніцы паведамляюць наступныя цікавыя падрабязнасьці таго, як была арганізава так званая «Інтэрманляндзкая» кампанія ў Фінляндыі.

11-га красавіка г. г. па ініцыятыве шуцкораўскіх (фашысцкіх) арганізацый у Гельсінфорсе адбылася парада раду асоб ваенных і шуцкораўскіх дзеячоў з удзелам прадстаўнікоў існуючых у Фінляндыі актывісцкіх арганізацый. Сярод прысутных знаходзіліся—**начальнік генэральнага штабу** генэрал Эш і начальнік штабу шуцкораў генэрал **Паляярві.** Сход заслухаў рад дакладаў, у якіх рабіліся паведамленьні аб ходзе калектывізацыі і раскулачваньні ў раёнах Ленінградзкай вобласьці, населеных інграмі (фінскае племя). У дакладах канстатавалася, што ў выніку працэсаў, якія адбываліся ў СССР, **наносіцца цяжкі ўдар тэй «рабоце», якую адваедныя фінскія арганізацыі вядуць на савецкай тэрыторыі.**

На сходзе былі прадстаўлены два пункты гледжаньня: адзін прапануе пачаць агрэсыўныя дзеяньні, а другі—абмежваецца пакуль што друкаваньнем і агітацыйнай кампаніяй як у Фінляндыі, так і ў Зах. Эўропе і Амэрыцы. Перамог апошні пункт гледжаньня. Сьледам за гэтай нарадай па ўсёй Фінляндыі разгарнулася шалёная антысавецкая кампанія друку, а таксама шляхам насылкі пэтыцый і «дэлегацый

На III усебеларускім зьезьдзе чыгуначнікаў

Гаспадарчы разрахунак укараніць ва ўсе зьвеньні транспарту

Ажыцьцяўленьнем новай крэдытнай рэформы, падняцьцем адказнасьці за работу, новым уздымам спаборніцтва і ўдарніцтва, ліквідацыяй абязьлічкі ва ўсіх частках транспарту забясьпечым выкананьне вялізарных задач, якія стаяць перад транспартам у рэканструкцыйны пэрыяд

Пераход на гаспадарчы разрахунак ператварыць у масавую гаспадарча-палітычную кампанію, шырока папулярызуючы сутнасьць і мэты гэтага мерапрыемства

Тав. Гей на зьезьдзе чыгуначнікаў

Учора перад закрыцьцём III Усебеларускага зьезду чыгуначнікаў з вялікай прамовай выступіў генэральны сакратар ЦК КП(б)В т. **Гей.** Даклад т. Гея будзе зьмешчан у заўтрашнім нумары газэты.

Зьезд выбраў новы склад Белбюро ЦК чыгуначнікаў.

Пленум Белбюро выбраў старшынёй т. **Бэрзінга.**

Транспартная каапэрацыя — адзін з асноўных цэхаў транспарту

Яна патрабуе канкрэтнай дапамогі ўсіх чыгуначных арганізацый

Транспартная каапэрацыя — адзін з асноўных цэхаў транспарту, — гаворыць у сваім дакладзе аб становішчы і рабоце транспартнай каапэрацыі БССР упаўнаважаны саюзнай трансасэкцыі СССР па Беларусі тав. **Бурачэўскі.** Адтак, ня ўсюды яшчэ зразумелі гэта. Многія мясцовыя прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі не дапамагаюць аднаўленьню і наладжаньню работы транспартнай каапэрацыі, на сапраўдным абслугоўваньні чыгуначнікаў. Органы каапэрацыйнай грамадзкасьці (каапбюро, крамныя і сталовыя камісіі і інш.) па радзе чыгуначных станцый по арганізаваны, а там, дзе арганізаваны, працуюць зусім слаба. Рабочага кантролю над работай ТСТ (транспартнае спажывецкае таварыства) фактычна няма.

У БССР арганізавана ўсяго 4 раённых і 2 вузлавых ТСТ. Сетка гандлёвых прадпрыемстваў і грамадзкага харчаваньня больш 200, якія абслугоўваюць 175.112 спажыўцоў. Найшчыкаў ТСТ 60.000, што складае 60-65 проц. асноўнага дарослага чыгуначнага насельніцтва. Рост каапэраваньня ні ў якім разе нельга лічыць здавальняючым. Асабліва слабе ідзе вярбоўка ў найшчыкі сярод рабочых новых чыгуначных пабудоў і сэзоннікаў.

ТСТ мае прыгарадныя гаспадаркі, з агульнай плошчай 3.369 гэкт. Адно менскае ТСТ ня мае самастойных прыгарадных гаспадарак, а будзе забясьпечвацца прадукцыяй прыгарадных гаспадарак МПРК. Веснавая сяўба ў прыгарадных гаспадарках разгортваецца марудна. Зусім мала прыцягнута да практычнага ўдзелу ў рабоце гаспадарак чыгуначнікаў. Ня ўсюды праведзена прымацаваньне рабочых прадпрыемстваў да асобных агародных вучасткаў. Няма плянаў арганізацыі працы ў гаспадарках.

Перабудова работы ТСТ у сувязі са зьменай крэдытнай рэформы, пераход каапэрацыйных прадпрыемстваў на гаспадарчы разрахунак праходзіць слаба. Рабочыя масы для ўдзелу ў гэтай важнейшай рабоце ня прыцягнуты.

Па асобных ТСТ (Жлобін і інш.) не наладжана пераважнае і першачарговае забесьпячэньне ўдарнікаў. Слаба праходзіць мабілізацыя сродкаў насельніцтва, асабліва па паях (за сакавік выкананa толькі 22,7 проц. квартальнага заданьня, замест патрэбных ня менш 40 проц.). Асабліва адстаюць магілёўскае і менскае ТСТ. Дрэнна працуе апарат ТСТ, ён яшчэ цалкам не ўкамплектаваны.

Вызначаючы галоўныя задачы ТСТ тав. **Бурачэўскі** асабліва завастрае ўвагу на неабходнасьць правядзеньня прынцыпаў **гаспадарчага разрахунку** на ўсіх частках работы ТСТ і ўзмацненьня практычнага ўдзелу чыгуначнікаў у **сканчэньні веснавой сяўбы ў прыгарадных гаспадарках.**

Да канца бягучага году павінна быць ахоплена каапэраваньнем ня менш 90 проц. усяго дарослага чыгуначнага насельніцтва. Неабходна разгарнуць шырокую растлумачальную работу вакол гэтага пытаньня.

Арганізацыйны масавага рабочага кантролю зьніжу будзе забясьпечана сваячасовае зьніжэньне злачынстваў і шкодніцтва ў рабоце ТСТ, хутчэй будзе настаўлена работа ТСТ на адпаведную вышыню.

Гаспадарчы разрахунак ва ўсе звеньні транспарту

Разгарнуць растлумачальную работу вакол новай крэдытнай рэформы

Упаўнаважаны Наркамшляху пры СНК БССР і дырэктар дарог МБВ тав. **Палюдаў** у сваім дакладзе аб становішчы дарог асноўнае месца адвёў пытаньню пераводу транспарту на гаспадарчы разрахунак. Перабудова работы чыгуначных арганізацый да гэтага часу праходзіла надзвычай марудна. Гаспадарчы разрахунак, які павінен быць праведзен ва ўсіх галінах работы транспарту, патрабуе асаблівага ўзмацненьня тэмпаў перабудовы, канкрэтызацыі кіраўніцтва, правільнай расстаноўкі сіл. Гаспадарчы разрахунак прымусіць выразна працаваць, змагацца за выкананьне вымяральнікаў і гаспадарнікаў, і рабочых, і клінтуру. Вакол кампаніі пераходу на гаспадарчы разрахунак трэба мабілізаваць увагу ўсіх чыгуначнікаў, трэба разгарнуць шырокую папулярызацыю важнасьці гэтага мерапрыемства. На аснове правядзеньня гэтай кампаніі, як масавай, будуць дасягнуты поўныя посьпехі ў справе выкананьня абавязацельстваў па ўзаемных дагаворах. Сыстэма новага крэдытаваньня зьяўляецца цьвёрдай сыстэмай і ніякіх адступленьняў ад яе ня будзе.

Тав. Палюдаў падкрэсьліў неабходнасьць хутчэйшага ўвядзеньня зьдзельнай і прэміяльнай сыстэмы зарплаты, якая стымулюе павышэньне прадукцыйнасьці і якасьці працы, сапраўднае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва. «Ураўнілаўку» ў зарплаце на транспарце трэба зьнішчыць да канца.

Спыняючыся на выніках ліквідацыі абязьлічкі, тав. Палюдаў завастрае ўвагу на неабходнасьць рашучай барацьбы з усё яшчэ вялікім процантам зрываў спаранай, якія тлумачацца нераспарадчасьцю і супраціўленьнем асобных работнікаў транспарту. Тав. Палюдаў заклікае зьезд самым бязьлітасным чынам выкрываць віноватых і прыцягваць да суровай адказнасьці. Спаранае зьяўленьне важнейшым фактарам аздараўленьня паравознай гаспадаркі і ўсякім перашкодам на яе шляху трэба абвясьціць жорсткую барацьбу.

У мэтах падняцьця прадукцыйнасьці працы і ўстанаўленьня адказнасьці за даручаную работу абязьлічка павінна быць ліквідавана ва ўсіх галінах работы транспарту. Абязьлічка павінна быць ліквідавана ня толькі сярод паравозьнікаў, але і ў дэпо і сярод адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу аж да стрэлачніка і змазчыка.

Тав. Палюдаў, спыняючыся на пытаньні ўліку работы, падкрэсьлівае, што да гэтага часу гэта справа зьяўляецца найбольш неналаджанай. Тав. Палюдаў прапануе у рабоце дэпо ўвесьці штамесячныя аналізы работы, якія шырока абгаворваць на вытворчых нарадах.

— У нас яшчэ,—гаворыць т. Палюдаў, — вагоны прастойваюць па 16-18 гадз., знаходзячыся фактычна ў руху каля 6-8 гадз. у той час, калі транспарт адчувае такі недахват вагонаў. Ня лепшае становішча і з выгрузкай. Замест 27 проц., якія павінны быць пад выгрузкай, у нас стаіць 45-48 проц. вагонаў.

Цьвёрдым правядзеньнем адзінаначальля, падняцьцем працоўнай дысцыпліны, ліквідацыяй абязьлічкі ва ўсіх зьвеньнях і разгортваньнем спаборніцтва забясьпечым ліквідацыю прарываў, хутчэйшы ўздым транспарту.

Блатолаў—дэлегат зьезду токар Гомельскага дэпо

Аздаравіць парт'ячэйку Белкаапсаюзу

У апараце Белкаапсаюзу слаба адчуваецца работа парт'ячэйкі. Ячэйка ня ўжыла належных захадаў, каб забясьпечыць поўнае і выразнае выкананьне дырэктыў партыі аб рабоце каапэрацыі. Зусім невыстарчальна вядзецца барацьба супроць цяганіны і момантаў бюракратызму. Рабочыя-выпучэнцы, якія працуюць у апараце, ня маюць належнай дапамогі і падтрыманьня. Ёсьць факты ігнараваньня іх паасобнымі адказнымі работнікамі Белкаапсаюзу.

У самой ячэйцы пануе нездаровая атмасфэра: мананаты сямейнасьці і групоўшчыны, нядбайныя адносіны некаторых партыйцаў да выкананьня даручаных ячэйкай абавязкаў.

Сакратар ячэйкі тав. Гінзбург (работчы выпучэнец) у сваёй рабоце па зьнішчэньні гэтых нездаровых зьявішч і ў мерапрыемствах па ўзмацненьні партыйнай дысцыпліны ня толькі ня мае патрэбнага падтрыманьня, а нават сустракае супраціўленьне з боку раду партыйцаў і часткі членаў бюро ячэйкі. Аб такім зьявішчы сьведчаць факты супраціўленьня рабоце па разгортваньні ў апараце сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

— Ты свае парадкі не ўвядзеш у нас, бо гэта не прадпрыемства,—заяўляе нам, старшыні мясцкому Гурвіч, апраўдваючы сваё адмаўленьне ад выкананьня дырэктыў бюро ячэйкі.

Нядаўна ў Белкаапсаюзе меў месца абураючы выпад спэцыяліста будаўнічага сэктару—Пальчыкава супроць саспаборніцтва і ўдарніцтва. На прапанову абвясьціць сябе ўдарнікам Пальчыкаў адказаў:

— «Мне ня трэба вашага ўдарніцтва і чырвоных рубах, я ўдарнікам быць не хачу».

Чые настроі і якую ідэалёгію выказвае гэты спэц сваёй заявай—зразумець ня цяжка. Яго гіронія па адрасе рабочых-выпучэнцаў абд «чырвоных рубахах» і яго заява «ня трэба мне ВАШАГА ўдарніцтва», мякка кажучы, паказваюць настрої ня НАШАГА чалавека.

Замест таго, каб неадкладна рэагаваць на гэта выступленьне Пальчыкава, нам. старшыні МК Гурвіч імкнуўся ЗАМАЗАЦЬ гэту справу, ігнаруючы пастановы бюро ячэйкі на конт гэтага. Апрача таго, на настойлівае патрабаваньне сакратара ячэйкі—рэагаваць па саюзнай лініі на паводзіны Пальчыкава, Гурвіч адказаў лаянкай.

Характэрна, што пры абмеркаваньні на бюро ячэйкі пытаньня аб паводзінах Гурвіча большасьць членаў бюро ячэйкі (Альпяровіч, Нісенбаўм, Хаскін, Максімчук) прымірэнча аднеслася да паводзін Гурвіча, які ігнараваў дырэктывы бюро ячэйкі. Замест прыцягненьня Гурвіча да партыйнай адказнасьці, бюро ячэйкі абмежавалася пастановай «указаць Гурвічу на нерашучасьць у рэагаваньні на выступленьні супроць ударніцтва».

Вядома, што гэта ёсьць сямейны падыход да справы, а не бальшавіцкая пастаноўка пытаньня. Гурвіч за сабатаваньне дырэктыў ячэйкі на працягу доўгага часу, за апартуністычныя паводзіны павінен быць прыцягнут да партыйнай адказнасьці, а таксама яго абаронцы і прымірэнцы, якія знаходзяцца ў складзе бюро ячэйкі.

Наогул становішча ў ячэйцы Белкаапсаюзу патрабуе праверкі і ўжыцьця адпаведных мер для аздараўленьня работы.

Партыец

Злачынная безгаспадарчасьць

У доме № 1 па Старажоўскай вуліцы ёсьць вялікі фруктовы сад і гарод. Дрэвы ўсе маладыя, пымат кустоў агрэсту, маліны, трускавок і г. д.

Дом належыць жакту № 15, які зусім не наглядае за садам і гародам. За зіму поўнасьцю зьнішчаны ўсе платы вакол саду. Цяпер па садзе пасуцца козы і сьвіньні. Як у мінулым годзе, сёлета таксама сад не ачышчан ад сухога лісьця, гальля, розных сарнякоў, дрэвы не акапаны, не пабелены, і г. д.

Трэба пакончыць з гэтай злачынай безгаспадарчасьцю і выратаваць сад ад зьнішчэньня. Яшчэ ня позна.

М.

Выкарыстаць бляшанкі з падкансэрваў для падсочкі сасны

Бляшанкі з пад кансэрваў, кавы, какао і г. д. не скарыстоўваюцца. Між тым іх можна з посьпехам утылізаваць у якасьці прыёмнікаў для падсочкі сасны. Гэта ў значнай меры зьнізіла б сабекошт кожнай топы жывіцы.

Трэба арганізаваць збор гэтых бляшанак і ўтылізаваць іх. Бляшанкі павінны здавацца вучдэтасам.

Трусаў З.

КАДРАВІКІ ТРАСПАРТУ СМЫКАЎ і ЛАПКОЎСКІ

ПАКАЗВАЮЦЬ УЗОРЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ АДНОСІН ДА ПРАЦЫ

Яны ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы ў барацьбе за трансфінплян. Тысячы ўдарнікаў транспарту павінны пасьледаваць іх прыкладу

Зьлева направа: дэлегаты зьезду—машыніст Аршанскага вузла СМЫЛКАЎ, кацельшчык Менскага вузла ЛАПКОЎСКІ гутараць з тав. ГЕЕМ. Побач старшыня белбюро ЦК чыгуначнікаў БЕРЗІНГ

Машыніст ударнага Аршанскага дэпо т. **Смыкаў** і кацельшчык Менскага вузла **Лапкоўскі** ўзялі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў па ліквідацыі прарываў на транспарце. Яны выклікалі дэлегатаў III Усебеларускага зьезду чыгуначнікаў пасьледаваць іх прыкладу. Вось тэкст іх дагавору, які быў абвешчаны на зьезьдзе:

Мы, дэлегаты 3-га Ўсебеларуска зьезду чыгуначнікаў, СМЫКАЎ—ударнік дэпо ст. ОРША, вытворчы стаж 30 год і ЛАПКОЎСКІ, кацельшчык дэпо ст. МЕНСК, ударнік, вытворчы стаж 22 гады, заслухаўшы і прадумаўшы справаздачныя даклады Белбюро ПК чыгуначнікаў і упаўнав. НК шляхоў па БССР пісьмы недапушчальным тое, што чыгункі БССР, выяўляючыся фарпостам Савецкага Саюзу на мяжы з фашысцкай Польшчай і Латвіяй, ня выконваюць вымяральнікаў трансфінпляну. Гэта можна вытлумачыць тым, што ўдарніцтва ў большасьці праходзіць самацёкам, без практычнай і штодзённай дапамогі і кіраўніцтва з боку прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый. Ударнікі яшчэ не зьяўляюцца цэнтральнай фігурай і апорай у перабудове работы.

Зыходзячы з гэтага, у інтарэсах узмацненьня гаспадарчай магутнасьці і абароназдольнасьці нашай краіны, нам, чыгуначнікам БССР, неабходна намагчы усе сілы і, ахапіўшы ўсіх рабочых САПРАЎДНЫМ ударніцтвам, дабіцца бальшавіцкіх тэмпаў у рабоце, каб на працягу месяца ў межах БССР ліквідаваць ўсе прарывы, выканаць ўсе вымяральнікі трансфінпляну, каб гэтым самым стаць для ўсіх чыгуначнікаў СССР узорам таго, як трэба змагацца за генэральную лінію нашай партыі.

З свайго боку, каб быць прыкладам мы, у гонар 3-га ўсебеларускага зьезду чыгуначнікаў, у дадатак да ўзятых кантрольных абавязкаў па выкананьні і перавыкананьні вымяральнікаў у парадку сацыялістычнага спаборніцтва, абяцаем выканаць наступныя абавязкі:

1. НА ПРАЦЯГУ ДЭКАДЫ РАСТЛУМАЧЫЦЬ І ДАВЕСЬЦІ ДА КОЖНАГА РАБОЧАГА ПАРАВОЗНАЙ БРЫГАДЫ, ДЭПО І ЦЭХУ ПАСТАНОВЫ ПРЫНЯТЫЯ 3-М ЗЬЕЗДАМ ЧЫГУНАЧНІКАЎ БЕЛАРУСІ.

2. НА ПАДСТАВЕ РАСТЛУМАЧЭНЬНЯ АБЯЦАЕМ ЗЬЕЗДУ НА ПРАЦЯГУ ДЭКАДЫ НАВЕРБАВАЦЬ 3 РАБОЧЫХ НАШЫХ СЛУЖБ 30 НОВЫХ УДАРНІКАЎ.

3. ШЛЯХАМ ПРАЛЕТАРСКАЙ НАСТОЙЛІВАСЬЦІ НА ПРАЦЯГУ ДЭКАДЫ ДАБІЦЦА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ Ў НАШЫХ СЛУЖБАХ ПАДЛІКУ УДАРНІЦТВА ПА БАЛАВАЙ СЫСТЭМЕ, ЯКАЯ ЗАВЕДЗЕНА РАБОЧЫМІ СТАНЦЫІ ЗІМА.

4. АБЯЦАЕМ У АГЛЯДЗЕ ПРАФРАБОТЫ І КОНКУРСЕ НА ЛЕПШАЕ ДЭПО І СТАНЦЫЮ, ЯКІЯ ПРАВОДЗЯЦЦА ЗАРАЗ, ПРЫНЯЦЬ АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ, РАЗГАРНУЦЬ ШЫРОКУЮ РАСТЛУМАЧАЛЬНУЮ РАБОТУ ЗА ЗБОР РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІХ ПРАПАНОЎ І ДАБІЦЦА ВЫКАНАНЬНЯ ІХ У ВЫЗНАЧАНЫЯ ТЭРМІНЫ.

5. ПРАЗ 13 ДЗЁН ПАСЬЛЯ ПРЫЕЗДУ НА МЕСЦА, ПРОСІМ РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТ «ЗЬВЯЗДА» І «ГУДОК», ПРАВЕРЫЦЬ І АСЬВЯТЛЯЦЬ НА СТАРОНКАХ ГАЗЭТ, ЯК МЫ ВЫКОНВАЕМ УЗЯТЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ.

6. Выклікаем усіх дэлегатаў—ударнікаў Гомельскага, Віцебскага, Жлобінскага і Ўнецкага раёнаў пасьледаваць нашаму прыкладу. Гэта зьявіцца лепшым адказам на гнусны паклёп імпэрыялістаў аб прымусовай працы ў СССР.

Дэлегаты 3-га ўсебеларускага зьезду чыгуначнікаў СМЫКАЎ, ЛАПКОЎСКІ.

Знаёмая песьня

Так, сапраўды знаёмая песьня. Мы ўжо чулі ня раз гэту старую апартуністычную песеньку, так улюбёную рыцарамі «левай» фразы. Як знаёмы яе словы і матывы, узятыя з арсэналу апартуністычных «тэорый». Якія ясныя яе заточаныя мэты...

Аартуніям у сваёй барацьбе супроць генэральнай лініі партыі ня раз займаўся адкрытай палітычнай спэкуляцыяй. Спэкуляваць на паасобных памылках і недахопах, выкрытых і вылўленых самой партыяй, — сьвятое сьвятых тактыкі апартунізму.

Успомнім, з якой шалёнай энэргіяй правабаўлі апартуністы выкарыстаць імі-ждапушчаныя «левыя» загібы для барацьбы супроць партыі. Успомнім, як імкнуліся яны дыскрэдытаваць ленінскі ЦК УсеКП(б), спэкулюючы на асобных памылках у калгасным руху, дапушчаных рядам арганізацый.

У КП(б)В апартуністы з вялікай старанасьцю спэкулявалі на прышчэпаўчынне. У сваіх нікчэмных спробах падарваць непахісны аўтарытэт палітычнай лініі КП(б)В і яе Цэнтральнага Камітэту яны прабавалі пераваліць віну за прышчэпаўчыну на... партыю і яе кіраўніцтва. Закрываючы вочы на сапраўднасьць і жанглюючы скажонымі фактамі, яны ўпарта даказвалі, што «ЦК КП(б)В невыстарчальна змагаўся з кулацкай палітыкай і практыкай у аграрным пытаньні». Адсюль бралі свой пачатак апартуністычныя вылазкі супроць лініі КП(б)В і яе ЦК. Адсюль апартуністы пад прыкрыцьцём «левай» дэмагогіі чэрпалі мізэрныя «тэарытычныя» довады.

Партыйныя масы Беларусі далі жорсткі адпор усякага роду палітычным спэкулянтам з права-«левага» лягеру. Спроба апартуністаў пад шыльдай барацьбы з прышчэпаўчынай дыскрэдытаваць палітычную лінію Цэнтральнага Камітэту партыі скончылася поўным крахам. Апартуністам не ўдалося пахіснуць жалезнае адзінства бальшавіцкіх радоў. Іх бездапаможны візг аб «невыстарчальнай барацьбе з нацыянал-кандрацьцеўшчынай» не пахісну ні на адну сэкунду адданага давер'я партыйных мас да свайго выпрабаванага кіраўніцтва.

Амататары палітычнай спэкуляцыяй атрымалі на заслугах. Аднак, ня ўсе з іх зрабілі адсюль неабходныя вывады. Мае рацыю пагаворка, якая сьцьвярджае, што дурныя прыклады заразьлівыя. Сям-там зноў чуюцца знаёмыя матывы старой песенькі палітычных спэкулянтаў. На гэты раз місію энігона «левакоў» узяў на сябе тав. Ганін. У часопісі «Социалистическая реконструкция сельского хозяйства» зьмешчан яго артыкул «Пытаньні калектывізацыі БССР». Маркуючы на зьмесьце артыкулу, аўтар паставіў сабе мэту асьвятліць ход калектывізацыі ў Беларусі. Хвалёная задача. Як-жа яна ажыцьцёўлена? Ці адлюстроўвае артыкул барацьбу партыі над кіраўніцтвам яе Цэнтральнага Камітэту за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі? Ці адказвае яна палітыцы і практыцы КП(б)В і яе ЦК у калгасным руху?

Не, далёка не. Артыкул тав. Ганіна **аб'ектыўна** зьяўляецца чарговым дакумантам з тэй-жа галіны «лявацкай» спэкуляцыі. Бюро ЦК партыі зусім верна кваліфікуе гэты артыкул, як «лявацкі» наскок на палітычна правільную і пасьлядоўную лінію Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б. Зьмест і галоўныя ўстаноўкі артыкулу тав. Ганіна яркa ілюструюць і пацьвярджаюць правільнасьць гэтай ацэнкі. Пяройдзем да фактычнага стану рэчаў.

... Гістарычныя перамогі калгаснага руху, дасягнутыя пад бальшавіцкім кіраўніцтвам КП(б)Б і яе Цэнтральнага Камітэту — відавочны. Адмаўляць іх — значыць адмаўляць сапраўднасьць. Партыя разграміла прышчэпаўчыну і нанесла руйнуючыя ўдары па шкодніцкай ідэалёгіі нацыянал-кандрацьцеўшчыны. Рэшткі нацыянал-кандрацьцеўшчыны з посьпехам выкарчоўваюцца. Стаўка беларускай контр-рэвалюцыі — нацыянал-дэмакратаў, гэтых нацыянал-фашыстаў —на сталыпінскі хутар зруйнавана. Асноўныя масы сялянства крута і беспаваротна павярнулі на шлях сацыялізму. Нараджоныя ў агні жорсткай клясавай барацьбы з кулацтвам, калгасы вырасьлі і ўмацаваліся. Звыш 200 тыс. бядняцка-сераднядняцкіх гаспадарак ужо аб'ядналіся ў калгасы. Нарастае новая магутная хваля калгаснага прыліву. Дзесяткі раёнаў ужо калектывізаваны больш, чым на 30 проц. Паасобныя раёны рашуча падыйшлі да завяршэньня суцэльнай калектывізацыі. Пераможнае ажыцьцяўленьне пяцігодкі за чатыры гады падводзіць над калектывізацыю БССР магутную індустрыяльную базу. Трактарызацыя і мэханізацыя сельскай гаспадаркі — гэтыя гіганцкія рухавікі калгаснага будаўніцтва — растуць з кожным днём. У суадносінах клясавых сіл у вёсцы адбыліся вялізарнейшай гістарычнай важнасьці зрухі. Калгаснае сялянства зрабілася асноўнай і моцнай апорай савецкай улады ў вёсцы. Кулацтва, гэта апошняя апора міжнародняй буржуазіі, «асуджана і будзе ліквідавана» (І. Сталін).

Гэтыя перамогі дасягнуты таму, што наша партыя, пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)В непрымірыма змагалася за сваю генэральную лінію, супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі, і «левых» загібаў. Яны дасягнуты таму, што КП(б)В і яе выпрабаваны рулявы — Цэнтральны Камітэт, — няўхільна ажыцьцяўляючы ленінскую нацыянальную палітыку, своячасова і рашуча разгарнулі бязьлітасную барацьбу з тэорыяй і практыкай нацыянал-кандрацьцеўшчыны. Яны дасягнуты таму, што партыя ў адкрытым бай, пад кіраўніцтвам ЦК, дапушчэнту разьбіла прышчэпаўшчыну, якая зьявілася адным з найбольш небясьпечных праяўленьняў правага ўхілу па ўмовах БССР. Такія факты. Такая сапраўднасьць. Але не такая думка тав. Ганіна.

У сваім артыкуле тав. Ганін ставіць пад сумненьне ўсю тую вялізарную барацьбу Цэнтральнага Камітэту КП(б)В і ўсёй партыі супроць аграрнай праграмы нацыянал-дэмакратызму — праграмы капіталістычнай рэстаўрацыі. Тав. Ганін прабуе рэвізаваць палітычную лінію кіраўніцтва партыі ў барацьбе з прышчэпаўчынай у тэорыі і на практыцы. Ганін паўтарае даўно выкрытыя «левыя» фразы палітычных спэкулянтаў, якія прабавалі напракаць кіраўніцтву партыі ў «несваячасовай і невыстарчальнай барацьбе з кулацкай палітыкай Прышчэпава».

Канстатуючы ў пачатку артыкулу, што «нацыянал-кандрацьцеўшчына атрымала ў БССР шырокае распаўсюджаньне», тав. Ганін прыходзіць да першага і асноўнага выводу, які чырвонай ніткай праходзіць праз усю яго працу:

«Адпор афармленьню гэтай кулацкай ідэалёгіі, якая знайшла ў 1924-28 г.г. практычнае ажыцьцяўленьне праз органы Наркамзему БССР, быў ЯЎНА НЕВЫСТАРЧАЛЬНЫМ, НЕВЫСТАРЧАЛЬНЫМ ГЭТЫ АДПОР ПА ЛІНІІ АГРАРНАГА ПЫТАНЬНЯ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА І Ў ДАНЫ ПЭРЫЯД» (падкрэсьлена намі).

Знаёмая песьня, знаёмы паклёп. Наперакор фактам аўтар цьвердзіць, што ня толькі ў мінулым, але нават і зараз у 1931 годзе барацьба з нацыянал-кандрацьцеўшчынай разгорнута нездавальняюча. Паводле слоў Ганіна выходзіць, што і зараз КП(б)В і яе Цэнтральны Камітэт даюць невыстарчальны адпор кулацкай ідэалёгіі ў аграрным пытаньні.

Якія-ж аргументы ўжывае т. Ганін для апраўданьня гэтага паклёпу? На першы погляд у артыкуле іх нямала Але ларчык адчыняецца проста. Аўтар пайшоў на старым шляху апартуністаў. Ганін выкарыстаў улюбёны маньэўр палітычных спэкулянтаў у іх спробах дыскрэдытаваць партыйнае кіраўніцтва. Ён добрасумленна прайшоў міма ўсіх пастаноў зьезду партыі і пленуму ЦК аб барацьбе з нацыянал-кандрацьцеўшчынай. Ён ні слова не сказаў аб тэй вялізарнай барацьбе якую праводзіла КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК супроць контр-рэвалюцыйнай кулацкай палітыкі Прышчэпава. Старанна вылажыўшы сутнасьць мінулых прарываў у зямельнай палітыцы, ускрытых і да канца выяўленых самойжа партыяй, аўтар выкарыстаў іх для сваіх паклёпніцкіх выдумак. Зразумела, пры гэтым аб ролі партыі ў прыцыцы і выпраўленьні гэтых прарываў т. Ганін амаўчаў. Такі сакрэт фабрыкацыі паклёпу.

Недарэчнасьць і бязгрунтоўнасьць адзначаны вышэй цьвярджаньня тав. Ганіна відавочна. Даволі азнаёміцца з пастановамі зьезду нашай партыі і Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б, даволі паглядзець, як рос і разьвіваўся калгасны рух у Беларусі, як партыя рашуча і пасьлядоўна выкарчоўвала прышчэпаўшчыну, каб пераканаць ў гэтым.

... Мінулае кіраўніцтва Наркамзему БССР на чале з Прышчэпавым праводзіла кулацкую лінію. Яно насаджвала хутары. Яно штучна тармазіла калектывізацыю. Галоўнай сацыяльнай апорай прышчэпаўшчыны быў кулак. Прышчэпаў сьвядома прабаваў накіраваць разьвіцьцё сельскай гаспадаркі па каپіталістычным шляху. Аграрная палітыка нацыянал-кандрацьцеўшчыны выцякала з праваапартуністычнай устаноўкі на «багацеючага селяніна», іншымі словамі, на кулака, на капіталістычнага фэрмэра. Гэта кулацкая лінія б. кіраўніцтва Наркамзему была сустаўной часткай праграмы і практыкі беларускай агентуры інтэрвэнтаў — нацыянал-дэмакратаў.

Якая-ж была ў гэты пэрыяд установка партыі ў пытаньнях разьвіцьця сельскай гаспадаркі? Яшчэ X зьезд КП(б)Б (1927 год) у сваёй рэзалюцыі па палітычнай справаздачы ЦК рашуча падкрэсьліў, што асноўнай задачай партыі зьяўляецца барацьба за **«разьвіцьцё калгаснага будаўніцтва».** Сьледам за гэтым XI зьезд КП(б)Б ясна паказаў шляхі разьвіцьця сельскай гаспадаркі:

«Узмацненьне аграмаджаных элемэнтаў у сельскай гаспадарцы і на далейшы час застаецца аднэй з важнейшых задач».

Што агульнага маюць гэтыя пастановы партыі з палітыкай Прышчэпава сталыпінскай хутарызацыі?

Ускрыўшы кулацкую дзейнасьць Прышчэпава, партыя мабілізуе свае сілы на барацьбу па выкарчоўваньні прышчэпаўскай палітыкі і практыкі, па ўзмацненьні калгаснага і саўгаснага будаўніцтва. У пачатку 1929 г. сабраўся XII зьезд КП(б)Б. Зьезд у рэзалюцыі па дакладу тав. Гамарніка рашуча паказаў на неабходнасьць:

«...з усёй сілай і энэргіяй праводзіць работу па ўзмацненьні і ўзбудженьні існуючых калгасаў і саўгасаў і ў далейшым значна ўзмацніць тэмп калектывізацыі сельскай гаспадаркі і будаўніцтва саўгасаў, зварачаючы асаблівую ўвагу на стварэньне буйных калгасаў».

Адразу-ж пасьля зьезду партыі зьнімаецца кіраўніцтва Наркамзему на чале з Прышчэпавым. Партыйны друк Беларусі разгортвае жорсткую барацьбу з канкрэтнымі праяўленьнямі нацыянал-кандрацьцеўшчыны. Даволі было тав. Ганіну праглядзець камплекты «Зьвязды» за гэты пэрыяд, каб знайсьці цэлы рад падрабязных матар'ялаў, выкрываючых сутнасьць «культурных гаспадарак», гэтых апорных пунктаў контр-рэвалюцыйнай нацыянал-кандрацьцеўшчыны. У гэты-ж час выкрываюцца скажэньні ў крэдытаваньні сельскай гаспадаркі, якія дапамагалі росту і ўзмацненьню кулацтва.

Цэнтральны камітэт партыі яшчэ больш рашуча ўзмацняе барацьбу за ліквідацыю хутарской сыстэмы, якую так старанна на працягу раду год насаджвалі нацыянал-кандрацьцеўцы. 13-га мая Бюро ЦК прымае спэцыяльную пастанову аб карэнным перагляданьне норм зямлякарыстаньня ў БССР.

Верасьнёўскі пленум ЦК КП(б)Б (1929 год.) да канца выкрыў прышчэпаўчыну ў тэорыі і на практыцы і мабілізаваў усю партыйную арганізацыю на барацьбу за выкарчоўваньне рэштак нацыянал-кандрацьцеўшчыны. за ўзмацненьне тэмпаў калгаснага будаўніцтва. У адозве верасьнёўскага пленуму Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б да ўсіх членаў партыі гаворыцца:

«Пленум рашуча асудзіў работу Наркамзему Беларусі, які на працягу раду год праводзіў яўна праваапартуністычную лінію, лінію на кулацкі хутар, якая спыняла росту і ўзмацненьню кулацкіх элемэнтаў у вёсцы і тармазіла рост калектывізацыі вёскі (максымальная і мінімальная норма пры зямляналзяленьні, усямернае падтрыманьне арганізацыі кутароў і інш.). Гэта лінія Наркамзему ў зямельнай палітыцы і ва ўсёй практыцы праводзілася і пасьля таго, як партыя на XV зьезьдзе з усёй сілай паставіла пытань не аб калектывізацыі сельскай гаспадаркі, аб рашучым наступленьні на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі. Шматгадовыя памылкі ў зямельнай палітыцы былі выкрытыя пленумам да канца. Партыя адкідае і будзе адкідаць у бок тых, хто будзе тармазіць сацыялістычную рэканструкцыю гаспадаркі. Пленум заклікае КП((б)Б на рашучы бой з кулаком, з хутарскімі формамі зямляналзяленьня, з усімі ідэолёгамі хутарской гаспадаркі».

Рашучае выкрыцьцё прышчэпаўчыны і выкарчоўваньне яе практыкі прынесла рашаючыя зрухі ў разгортваньні калгаснага будаўніцтва. Да верасьнёўскага пленуму КП(б)Б ужо прышла ў рэзультаце непрымірымай барацьбы са скрыўленьнямі лініі партыі ў зямельнай палітыцы. За прайшоўшы год больш чым на 100% вырасла колькасьць каапераваных бядняцка-сераднядняцкіх гаспадарак. Колькасьць калгасаў да верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б вырасла на 180%. Сярэдні разьмер калгасаў БССР ужо тады перавысіў разьмер калгасаў многіх раёнаў РСФСР. Пытаньне, як змагала КП(б)Б гэтага дасягнуць, не разгарнуўшы своячасова барацьбы з прышчэпаўскай палітыкай і практыкай?

Як сумысьніць пастановы пленуму аб калгасным будаўніцтве і барацьбе з нацыянал-кандрацьцеўшчынай з паклёпам Ганіна аб «невыстарчальным адпоры»!?

Ганін вельмі нагадвае тых правых апартуністаў з б. кіраўніцтва Наркамзему, якія лезьлі са скуры, каб апраўдаць кулацкую контр-рэвалюцыйную дзейнасьць Прышчэпава. Іх вельмі ярка характарызаваў тав. Гамарнік у сваім дакладзе аб выніках верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б на сходзе Менскага партыйнага актыву (верасень 1929 г.).

**«Я павінен спыніцца ў некалькіх словах, — гаварыў тав. Гамарнік,—на мінулай дзейнасьці Наркамзему. На працягу некалькіх год гэты важнейшы апарат па сутнасьці на справе не знаходзіўся ў руках партыі. Ён ня выконваў лінію партыі, ён скажаў яе, на справе праводзіў праваапартуністычную лінію. Сёй-той з наркамземанскіх правых ухілістаў прабуе цяпер апраўдаць сваю кулацкую работу спасылкамі на паасобныя выразы, часамі няўразныя фармулёўкі некаторых адказных таварыш

20 мая—першы кантрольны тэрмін

МАРУДНАСЬЦЬ ПЕРАВОДУ КАЛГАСАЎ НА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ—АСНОЎНЫ ТОРМАЗ СЯЎБЫ

Масавы выхад у поле зрабіць адным з вагароў гаспадарчага замацаваньня новаарганізаваных калгасаў, далейшага ўздыму калгаснага прыліву і рашучага наступленьня на кулака, які імкнецца падарваць эканамічную моц калектыўных гаспадарак

Тэмпы сяўбы павольныя

Паводле няпоўных вестак з 34 раёнаў, на 5 мая па БССР засеяна 13.369 гэкт., з якіх калгасамі засеяна 5.269 гэкт., аднаасобным сэктарам —7.388 гэкт. і рэшта саўгасамі. Па асобных культурах засеяна: пшаніцы —1.305 гэкт., аўса—4.796 гэкт., ячменю—2.640 гэкт., бабовых—201 і інш. збожжавых культур—616. Слабей разгорнута сяўба тэхнічных культур, ільну засеяна 562 гэкт., канапель—50 гэкт., бульбы—1.848 і кормарыдлаў—35 гэкт.

Насеў траў таксама яшчэ не разгорнут. Так, аднагадовых траў засеяна 229, лубіну—415 гэкт.

Асноўная прычына адставаньня ў сацыялістычным сэктары заключаецца ва ўсё яшчэ няпоўным пераводзе калгасаў на зьдзельшчыну. Зьдзельшчына—усё яшчэ слабы участак калгаснай сяўбы. Ня гледзячы на дырэктывы цэнтральных арганізацый, на зьдзельшчыну перайшло толькі 59,6 проц. калгасаў.

Арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў моцна адстае ад тэмпаў калектывізацыі. Яшчэ нездавальняюча праходзіць аграмаджаньне рабочай жывёлы.

Усё яшчэ не закончана кантрактацыя яравых. Выканана толькі 80,3 проц. пляну.

Замацаваньне калгасаў, неадкладнае аграмаджаньне сродкаў вытворчасьці і поўны перавод калгасаў на зьдзельшчыну зьвяжуцца лепшымі сродкамі для скарачэньня тэрмінаў сяўбы.

Далей марудзіць нельга

Толькі 80,3 проц. закантрактавана яравых

Больш трох з паловай месяцаў прайшло з дня апублікаваньня адозвы СНК і ЦК УсеКП(б) аб кантрактацыі. Вызначаныя тэрміны сканчэньня кантрактацыі таксама ўжо прайшлі. Між тым па БССР, як і раней, мы маем ганебнае адставаньне ў выкананьні плянаў кантрактацыі яравых пасеваў.

На 6 мая рэспубліканскі плян кантрактацыі выканан толькі на 80,3 проц. Гэта ў той час, калі плян кантрактацыі збожжавых культур павінен быць поўнасьцю выканан яшчэ 15 красавіка.

Па асобных культурах плян кантрактацыі збожжавых выканан: па АЎСЕ НА 69 ПРОЦ., па ЯЧМЕНІ—72,6 ПРОЦ., па ГАРОСЕ І ФАСОЛІ—86,5 ПРОЦ. і па КРУПЯНЫХ — 124,6 ПРОЦ. Да кантрактацыі сена большасьць раёнаў не прыступіла. На 6 мая плян кантрактацыі сена выканан толькі на 30,4 проц.

5-га мая быў кантрольны тэрмін сканчэньня кантрактацыі тэхнічных культур. Між тым, па БССР на 6 мая мы маем выкананьне па ільне 72,2 проц., па канаплях—87,3 проц. і па бульбе—91,7 проц. Дырэктывы партыі, такім чынам, ня выканана.

Лепш разгортваецца кантрактацыя гародных культур. На 6 мая плян кантрактацыі капусты выканан на 109,3 проц., буракоў—на 166 проц., цыбулі—91 проц., гуркоў—87,1 проц. і махоркі—85 проц.

У некаторых раёнах да гэтага часу яшчэ ня зьнішчаны факты мэханічнага ўсталяваньня кантрактацыйных дагавораў без папярэдняй прапрацоўкі і абгаварэньня іх усёй масай кантрактантаў.

Асабліва ўвага павінна быць зьвернута месцамі на поўнае выкананьне ў бліжэйшыя дні пляну кантрактацыі тэхнічных культур.

Усёй сям'ёй у калга

ДА КОЖНАГА КАЛГАСЬНІКА

давесьці нормы зьдзельшчыны

НЕ ПАНІЖАЦЬ ШТУЧНА НОРМ ВЫПРАЦОЎКІ, НЕ ВЫЗНАЧАЦЬ НЕПАСІЛЬНЫХ НОРМ

Пастанова калегіі Наркамзему СССР і праўленьня Калгасцэнтру СССР

1. Першыя-ж дні правядзеньня на практыцы пастаноў VI-га зьезду саветаў аб арганізацыі працы ў калгасах паказалі, што скасаваньне падзёншчыны, арганізацыя працы ў калгасах на аснове зьдзельшчыны і ацэнкі работы ў працадзёнах — сустрэлі агульнае падтрыманьне пераважнай большасьці калгасьнікаў, якія дружна ўзяліся за правядзеньне зьдзельшчыны ў жыцьцё.

Пачатак сяўбы на Паўночным Каўказе і Украіне яшчэ раз паказаў, што ўжываньне зьдзельшчыны павышае ў 1½-2 разы прадукцыйнасьць калгаснай працы. Асабліва важным пры гэтым зьяўляецца той факт, што ў большасьці старых калгасаў зьдзельшчына пачала ўжо набываць арганізаваны характар, грунтуючыся на распрацаваных праўленьнем калгасу і ўхваленых калгасьнікамі нормах выпрацоўкі і расцэнкі работ у працадзёнах.

2. У адпаведнасьці з недахопамі, якія выявіліся ў першыя дні практычнага правядзеньня зьдзельшчыны на Паўночным Каўказе і Украіне, Наркамзем СССР і Калгасцэнтр СССР прапануюць наркамземам і калгасцэнтрам саюзных рэспублік, усім краявым і абласным землераўніцтвам, крайкалгассаюзам, Трактарацэнтру, раёнам, райкалгассаюзам і машына-трактарным станцыям у далейшай рабоце над правядзеньнем зьдзельшчыны зьвярнуць асаблівую ўвагу на наступнае:

1) Новыя калгасьнікі невыстарчальна абслугоўваюцца дапамогай, адсутнасьць вопытных людзей затрудніе пераход новых калгасаў на зьдзельшчыну. Таму неабходна ва многа раз узмацніць дапамогу новым калгасам насылкай вопытных калгасьнікаў з старых калгасаў у новыя на першыя дні сяўбы спэцыяльна для наладжваньня зьдзельнай работы.

2) У радзе выпадкаў зьдзельшчына носіць фармальны характар, паколькі ўнутры брыгады ці групы кожнаму калгасьніку запісваецца адпавідкавая колькасьць працадзён незалежна ад таго, якую работу ён рабіў і як ён працаваў. Таму неабходна асобна прасачыць за тым, каб кожнаму калгасьніку, які працуе ў брыгадзе ці групе, залічвалася і запісвалася ў яго асабістую працоўную кніжку тая колькасьць працадзён, якая яму прылічваецца ў адпаведнасьці з праробленай ім асабістаю работай у сваёй групе ці брыгадзе, а ня тая колькасьць дзён, якая праведзена ім на полі, як гэта часта мае месца.

3) З прычыны таго, што назіраюцца дзьве крайнасьці пры ўстанаўленьні норм зьдзельшчыны:

а) першая крайнасьць — даюцца нормы вельмі малыя, у выніку чаго невыстарчальна выкарыстоўваюцца машыны, інвэнтар і праца калгасьнікаў, што асабліва небясьпечна з прычыны сэзоннага характару сельска-гаспадарчай вытворчасьці;

б) другая крайнасьць — даюцца нормы, непасільныя нават для вопытных і старанных калгасьнікаў, у выніку чаго вырастае ў калгасьніка імкненьне павярнуць назад да падзёншчыны, — неабходна абедзьве гэтыя крайнасьці зьнішчыць, для таго крайзу, крайкалгассаюзы, райзу і райкалгассаюзы абавязаны штодзённа друкаваць у газэтах (краявых, раённых, насьценных) нормы, прынятыя лепшымі калгасамі і сапраўды сябе апраўдаўшыя, дабіваючыся іх шырокага ўжываньня.

4) З прычыны таго, што назіраюцца шматлікія выпадкі, калі край(аблзу), крайкалгассаюзы і нават праўленьні калгасаў лічаць сваю работу скончанай устаноўкай нормы выпрацоўкі і ацэнкай работы ў працадзёнах, хаця гэтыя нормы не даведзены да калгасьнікаў і большасьць калгасьнікаў яшчэ ня ведае, за якую работу і колькі яны атрымаюць працадзён, — НКЗ СССР і Калгасцэнтр СССР асобна падкрэсьліваюць, што пераход на зьдзельшчыну можна лічыць ажыцьцёўным толькі тады, калі сапраўды кожны калгасьнік і калгасьніца, прыступаючы да якой-небудзь работы, загадяе ведаюць у дакладнасьці, якую норму выпрацоўкі абавязаны выкапаць, колькі працадзён, за якую колькасьць і якасьць гэтай работы ім будзе залічана.

5) З прычыны таго, што ў некаторых калгасах усё яшчэ мае месца слабае ўцягненьне калгасьніц у агульную калгасную працу, абавязаць краявыя, абласныя і раённыя калгассаюзы і праўленьні калгасаў прыняць усе неабходныя меры да шырокага ўцягненьня калгасьніц у работу калгасаў, дабіваючыся гэтым самым вызваленьня рабочай сілы калгасьнікаў на адыход.

6) З прычыны таго, што ў радзе выпадкаў новаарганізаваныя машына-трактарныя станцыі да гэтага часу не аддаюць належнай увагі арганізацыі працы ў калгасах і пераходу калгасаў на зьдзельшчыну, НКЗ СССР і Калгасцэнтр СССР указваюць усім дырэктарам машына-трактарных станцый на тое, што задача арганізацыі працы ў калгасах і перавод калгасаў на зьдзельшчыну зьяўляюцца такім-жа абавязкам машына-трактарнай станцыі, як і арганізацыя трактарных работ.

Народны камісар земляробства СССР — ЯКАЎЛЕЎ
Старшыня Калгасцэнтру СССР — ЮРКІН.

ТРАКТАРЫ БЯЗ ПЛУГОЎ

Саўгас «ПІРЭВІЧЫ», Жлобінскага раёну, атрымаў 4 трактары, але плугоў да іх дагэтуль не даслалі. Ня гледзячы на тое, што саўгас ужо фактычна пачаў палявыя работы, Белсельтрэст да гэтага часу ня ўжыў ніякіх мер, каб забясьпечыць саўгас прычэпнымі плугамі.

ВЫШЭЙ ТЭМПЫ СЯЎБЫ

ў прыгарадных гаспадарках

Саўгасы МЦРК яшчэ не перайшлі на зьдзельшчыну

Шэндэраў супроць зьдзельшчыны

Саўгас **«ЧЫРВОНЫ ТРАНСПАРТНІК»** (Лошыца) даволі буйная прыгарадная гародна-малочная гаспадарка МЦРК, якая навінна забясьпечваць рабочых менскіх прадпрыемстваў гародзінай і малочнымі прадуктамі. Фэрма займае каля 400 гэктараў. Там працуе каля 200 рабочых.

У саўгасе зараз разгарнуліся палявыя работы. Ня гледзячы на гэта, зьдзельшчына там яшчэ ня ўведзена.

Студэнты-практыканты сельска-гаспадарчага тэхнікуму, якія працуюць у саўгасе ў якасьці рабочых, паставілі перад адміністрацыяй пытаньне аб пераводзе іх на зьдзельшчыну. На гэта яны атрымалі адказ, што яшчэ ня вызначаны нормы выпрацаўкі і таму на зьдзельшчыну іх перавесьці нельга.

У саўгасе адчуваецца недахват працоўнай сілы. Працоўная дысцыпліна не на вышыні, прагулы сталі сыстэмай. Ня гледзячы на гэта, адміністрацыя марудзіць з пераводам палявых работ на зьдзельшчыну. Парнікавод **ШЭНДЭРАЎ** (былы досыць буйны ўласьнік парнікова-гародняй гаспадаркі) нават супраціўляецца правядзеньню зьдзельшчыны. Калі некаторыя студэнты працавалі зьдзельна, Шэндэраў перавёў іх на падзённую аплату.

У выніку ў саўгасе яшчэ не распачата сяўба. Плян закладкі парнікоў ня выканан. За апошнія дні ў саўгасе захварэла 7 коняй.

Студэнты-практыканты, якія там працуюць, знаходзяцца ў немагчымых бытавых умовах. Зранку і ўвечары рабочыя саўгасу ня маюць вару. З-за галавацяпства загадчыка саўгасу студэнты-практыканты ня могуць атрымаць абедаў.

Брыгада «Зьвязды».

АД РЭДАКЦЫІ: 15 красавіка—апошні тэрмін пераводу на зьдзельшчыну саўгасаў і калгасаў. З таго часу прайшло ўжо 3 тыдні—тэрмін зусім выстарчальны, каб прыгарадныя гаспадаркі МЦРК былі пераведзены на зьдзельшчыну. Між тым, як відаць з вышэйпаказанай заметкі, а таксама паводле іншых вестак, атрымэных рэдакцыяй, у радзе прыгарадных саўгасаў МЦРК зьдзельшчына яшчэ ня ўведзена (саўгас МІХАЛОВА і інш.).

Сельска-гаспадарчы аддзел МЦРК не пацікавіўся праверыць як выконваецца яго дырэктыва аб пераходзе на зьдзельшчыну. Гэта значыць, што сельска-гаспадарчы аддзел МЦРК недаацэньвае значэньня зьдзельшчыны ў справе ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы, у справе ўшчыльненьня тэрмінаў сяўбы і разгортваньня ўдарніцтва і сацыялістычнага спаборніцтва на палявых работах.

Насенная дапамога

раёнам, пацярпеўшым ад паводкі і вымочкі

Веснавой паводкай у некаторых мясцох папсавана частка азімых пасеваў і пасеўны матар'ял. У зьвязку з гэтым Савет Народных Камісараў БССР пастанавіў аказаць дапамогу калгасам і бядняцка-серадняцкім гаспадаркам, выдаўшы ім дзяржаўную насенную пазыку, бяспроцантную з зваротам яе пасеўшчыкамі пасьля збору ўраджаю 1931 г. Для аказаньня дапамогі дзяржавай адпускаецца 50 тысяч цэнтнэраў аўса, 14 тысяч цэнтн. гароху і 15 тыс. цэнтн. ячменю і грэчкі.

На аснове пастановы ўраду народныя камісарыяты зямляробства і забесьпячэньня пастанавілі вызначаную насенную дапамогу разьмеркаваць паміж раёнамі. Прычым ІЛЬНАВОДНЫМ РАЁНАМ адпушчана аўса 14 тыс. цэнтн., ячменю 1.600 цэнтн., грэчкі — 7.600 цэнтн. і гароху — 3.700 цэнтн.

ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫМ РАЁНАМ адпушчана аўса 25.700 цэнтн., ячменю 1.600 цэнтн., грэчкі — 7.600 цэнтн. і гароху 4.750 цэнтн.

Садова-гароднім раёнам адпушчана аўса 3 тыс. цэнтн., ячменю 450 цэнтн., грэчкі — 700 цэнтн. і гароху 1.300 цэнтн.

Насенная дапамога павінна выдавацца пасеўшчыкам у крэдыт, зваротам натурай восенью 1931 г., але не пазьней 10-га кастрычніка. Дапамога гэта бяспроцантная.

Насеньне павінна выдавацца на падставе актаў сельсаветаў аб паводцы і вымачцы, пад адказнасьць райвыканкомаў і на аснове пастаноў апошніх. Райвыканкомы павінны прасачыць за тым, каб насенная дапамога была скарыстана на перасеў.

Саюзхлеб і Хлебажывёласаюз павінны забясьпечыць свячасовую перакідку збожжа ў раёны, якія пацярпелі ад паводкі.

Пасьля задавальненьня насеньнем калгасаў і аднаасобнікаў, пацярпеўшых ад паводкі, для перасеву, рэшткі насень ня могуць быць выданы райвыканкомамі кантрактаўшчыкам ільну і канапель у лік авансу жыта для пасеву яравога кліну.

Сустрэчны саўгасу Ўсьце—

да 30 мая закончыць сяўбу

3-ГА МАЯ СЬВІНАГАДОЎЧЫ САЎГАС УСЬЦЕ ПАЧАЎ ПАЛЯВЫЯ РАБОТЫ НА АСНОВЕ ЗЬДЗЕЛЬНАЙ АПЛАТЫ ПРАЦЫ. РАБОЧЫЯ САЎГАСУ ВЫСУНУЛІ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН І АБАВЯЗАЛІСЯ ДА 20 МАЯ СКОНЧЫЦЬ СЯЎБУ ЗБОЖАВЫХ І КОРАНЬПЛОДАЎ, А ДА 30 — КАРМАВЫХ ТРАЎ.

Барысаўская фэрма

НЯ МОЖА ПАЧАЦЬ СЯЎБЫ

Чакаем адказу Белкаапсаюзу

Сяўба на фэрме закрытага рабочага каапэратыву запалкавых фабрык **«Чырвоная Бярэзіна», «Пралетарская перамога»** і электрастанцыі **імя Леніна** (Барысаў) пад пагрозай зрыву. Дагэтуль фэрма ня мае рабочага і вытворчага пляну пасеўнай кампаніі. Гэта не дазваляе магчымасьці зрабіць заяўку на пасеўны матар'ял і набыць свалічасова інвэнтар.

Аграном, прысланы **Белкаапсаюзам** для складаньня пляну, прабыў у Барысаве два тыдні і ні разу не зайшоў у закрыты рабочы каапэратыў. У дзень ад'езду ён забег у каапэратыў склісьці плян пасеву і заявіў, што яго выклікаюць у Менск. Па хадайніцтве каапэратыву ён быў пакінут Белкаапсаюзам яшчэ на два дні. Але аграном гэтага зьнік з усімі матар'ялямі вось ужо дні.

Бюро парткалектыву і фабком.

АД РЭДАКЦЫІ: Мы чакаем адказу Белкаапсаюзу аб тым, што ім зроблена для канкрэтнай дапамогі фэрме закрытага рабочага каапэратыву. Якія ўжыты крокі для таго, каб забясьпечыць гароднінай буйнейшае прадпрыемствы БССР.

Мабілізаваць унутраныя рэсурсы

Забясьпечыць цягавую сілу кармамі

ПЛЕШЧАНІЦЫ. (Наш кар.).

Калгасы раёну выплі ў поле яшчэ да 1-га мая. Першы выезд паказаў, што калгасы поўнасьцю падрыхтаваны да правядзеньня другой бальшавіцкай сяўбы.

Слабым месцам калгасаў зьяўляецца падрыхтоўка цягавай сілы і забясьпячэньне яе кармамі. Большасьць калгасаў не стварыла фуражных кармовых фондаў для веснавой сяўбы. Некаторыя калгасы амаль зусім ня маюць кармоў.

Раённыя арганізацыі ня прымаюць ніякіх мер да ўзмацненьня загатовкі сена і саломы. Зусім ігнаруецца загатоўка корму з гальля.

А. Л.

Узьнімем ураджайнасьць нашых садоў

ДАВОЛІ ЛІЧЫЦЬ САДОЎНІЦТВА ДРУГАРАДНАЙ СПРАВАЙ

Садоўніцтва займае значнае месца ў сельскай гаспадарцы БССР. Пад садамі знаходзіцца каля 25.000 гэктараў. Гэтыя сады штогод даюць мільёны пудоў садавіны.

Але-ж трэба падкрэсьліць, што гэтыя сады могуць і павінны даць значна большы ўраджай, пры належным доглядзе іх.

У якім-жа становішчы знаходзяцца нашы сады? Ці ўсё зроблена, каб павялічыць іх ураджайнасьць? Трэба канстатаваць, што сады ў большасьці сваёй запушчаны і бясплотныя. Саўгасы і калгасы глядзяць на садоўніцтва, як на другарадную справу.

У БССР не хапае сродкаў для барацьбы са шкоднікамі садоў (жалезны і медны купарвасы, садовы клей, апырсківальнікі). Шкоднікі часта зьнішчаюць значную частку ўраджаю. Асноўнай прычынай гэтага зьяўляецца тое, што няма яшчэ поўнай арганізацыі, якая-б абслугоўвала саўгасна-калгасныя сады.

Для характарыстыкі становішча з садамі можна ўзяць **ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКІ** раён. Саўгас Рачкавічы, гэтага раёну, мае 36 гэкт. саду сярэдняга ўзросту. У гаспадарцы няма спэцыяліста па садоўніцтве і нават добрага садоўніка. Сад зусім не даглядаецца. Дрэвы пакрыты космамі лішайніку і моху. Засохшыя галіны не абрэзаны. Кара дрэў не абчышчана і не абмазана на вайнай. У гаспадарцы зусім няма ніякіх сродкаў для барацьбы са шкоднікамі.

Саўгас Боркі-Бялевічы мае два сады: адзін у Борках—4 гэкт., і другі ў Бялевічах — 14 гэкт. У Борках сад запушчан. Яго ніхто ніколі не даглядаў. Зьнімалі толькі ўраджай і ўсё. У выніку сад заглух, пасох і часткова вымерз, пакрыўся лішаямі і мохам. У гаспадарцы тут няма нават садовага рабочага. Ня лепш і становішча ў Бялевічах, дзе таксама няма садоўніка і сад надта запушчаны.

У калгасе «Ўдарнік» сад таксама надта запушчан, парос мохам. Шмаграў зусім пасохла. Ніякай барацьбы з садовымі шкоднікамі не вядзецца.

Для ўзьняцьця ўраджайнасьці нашых садоў неабходна тэрмінова ўжыць рад прасьцейшых агра-вытворчых мер прыемстваў. Па-першае, неабходна забясьпечыць усе гаспадаркі, якія маюць сады, адпаведным інструктажам з боку Белсадсаюзу. Па-другое, сады трэба забясьпечыць сродкамі барацьбы с шкоднікамі, як: нягашанавай вапнай, жалезным і медным купаросам, вусцічным клеем, апыгоўвальнікамі і г. д.

У садовых гаспадарках саўгасаў і калгасаў, дзе няма спэцыяльных садаводаў, трэба выдучыць старшых садовых рабочых з лепшых ударнікаў калгасьнікаў і саўгасьнікаў.

Не пазьней 10-га мая па ўсіх раёнах БССР неабходна правесьці праверку правядзеньня агра-мінімуму ў садовых гаспадарках саўгасаў, калгасаў і індывідуальнікаў.

Камсамольскія арганізацыі на вёсцы павінны быць ініцыятарамі паходу за ўзьняцьце ўраджайнасьці нашых садоў.

Аграном-садавод КАРПЕНКА.

Толькі 68 проц.

ПЛЕШЧАНІЦЫ

Кантрактацыя яравых пасеваў па **Каменьскім** сельсавеце праходзіць слаба. На сёнешні дзень плян кантрактацыі выканан толькі на 68 проц. Слабы ход кантрактацыі тлумачыцца адсутнасьцю масавай растлумачальнай работы. У выніку ёсьць вёскі, дзе кантрактацыя зусім ня прынята. Так, у вёсцы **Фільянава** тры разы кулакі зрывалі сход па кантрактацыі. Кулакі за зрыў кантрактацыі ня прыцягнуты да адказнасьці.

А. З.

Больш апэрацыйнага кіраўніцтва

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону, наш кар.). На 5-га мая ў калгасах раёну засеяна 500 гэкт., узарана 1.800 гэкт. Трэба прызнаць, што з боку райкалгассаюзу зусім не наладжана апэрацыйнае кіраўніцтва сяўбой.

1.053 гаспадаркі за месяц

уступілі ў калгасы

СЯННО. ДЗЯКУЮЧЫ РАЗГОРТВАНЬНЮ МАСАВАЙ ПРАЦЫ Ў ЧАСЕ МЕСЯЧНІКА ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ І ПАДРЫХТОЎКІ ДА СЯЎБЫ, У РАЁНЕ АРГАНІЗАВАНЫ НОВЫЯ 33 КАЛГАСЫ, ІДЗЕ ЗНАЧНЫ ПРЫЛІЎ У СТАРЫЯ КАЛГАСЫ. ЗА ГЭТЫ МЕСЯЦ ПРОЦАНТ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ВЫРАС З 20 НА 1-IV ДА 33 ПРОЦ., НА 1-V 31 г. ЗА МЕСЯЦ АБЪЯДНАЛІСЯ Ў КАЛГАСЫ НОВЫЯ 1053 БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІЯ ГАСПАДАРКІ.

РЭДАКТАР РАЁННАЙ ГАЗЭТЫ «КАМУНАР» ДАМБРОЎСКІ.

Кручанскі КСУ павінен вучыцца рабоце ў калгасьнікаў „III Інтэрнацыянал“

Крупляны.

Калгас імя III Інтэрнацыяналу падрыхтаваны да сяўбы. Насеньне цалкам ачышчана, с.-г. інвэнтар адрамантаваны. Мінэральнае ўгнаеньне вывезена. У калгасе ўведзена зьдзельшчына. Усе калгасьнікі разьбіты на брыгады, паміж якімі заключаюцца дагаворы па сацыялістычнае спаборніцтве. Некаторыя калгасьнікі абязьцілі сябе ўдарнікамі. Паводле сустрэчнага пляну, яравы клін павышан на 50 проц. І мая калгас пачаў сяўбу.

Адначасова трэба адзначыць, што Кручанскі КСУ, дзе знаходзіцца калгас, не праводзіць ніякай работы па падрыхтоўцы масавай сяўбы. Да гэтага часу аднаасобнікамі сельсавету ачышчана толькі 30 цнт. насеньня. У в. Дарашковічы і м. Кручы (цэнтр сельсавету) не ачышчана ніводнага цэнтнэра насеньня. Кулацкай агітацыі, накіраванай на зрыў збожжаачысткі, партыйная, камсамольская ячэйкі і сельсавет не далі ніякага адпору. Бядняцка-серадняцкія масы не мабілізаваны вакол важнейшага мерапрыемства па збожжаачыстцы.

Да апошняга часу КСТУ не сабраў ніводнага кілё насеньня, якое было раздана ў мінулым годзе. У выніку бяднейшая частка аднаасобнікаў ня будзе мець магчымасьці атрымаць патрэбную колькасьць насеньня, якога ў іх не хапае.

Гдаля Тралер.

У Вузьдзенскім раёне не замацоўваюць новаарганізаваных калгасаў

Безадкладна абагуліць коняй па калгасах

Калгасы павінны арганізавана выйсьці на бальшавіцкую сяўбу

ВУЗДА, 6.

Пастановы VI зьезду саветаў і III усебеларускага зьезду калгасаў прапрацаваны ў пераважнай большасьці насельніцтвам Вузьдзенскага раёну.

Вярбовачная камісія калгасу **«Іскра калектывізацыі»** правяла вялікую работу сярод аднаасобнікаў в. **Зеньківічы**, у выніку чаго 34 бядняцка-серадняцкія гаспадаркі гэтай вёскі ўступілі ў калгас.

З ліку арганізаваных па раёне ініцыятыўных груп у вёсках па арганізацыі калгасу, 7 груп за апошні час арганізаваліся ў калгасы і аб'ядналі: у в. Ярцы—60 гаспадарак, у в. Косьціцы—38 гаспадарак, Прусінава—13 гаспадарак, Цюрылава—12, Тоўсты-Лес—18, Александрава—10 і Літавец—11.

Наперадзе па калектывізацыі па раёне ідуць Магільнянскі і Камяноўскі сельсаветы, якія калектывізаваны вышэй як на 50 проц. Бядняцка-серадняцкія гаспадаркі в. в. Язьвіна, Галавачы, Лупін, Магільнянскага сельсавету, поўнасьцю калектывізаваны.

Гэтых посьпехаў партарганізацыя і саветы дабіліся на аснове масавай работы сярод беднякоў і сераднякоў сельсавету.

Найбольш адсталымі сельсаветамі ў раёне па разгортваньні масавага калгаснага прыліву зьяўляюцца: Прысынкаўскі, Цяпляўскі і Каменскі, дзе процант калектывізацыі не перавышае 6-7.

Райкалгассаюз ня кіруе работай ініцыятыўных груп і ня ведае колькі іх ёсьць у раёне.

Калгасы, якія арганізаваліся пасьля і студзеня, не абагульваюць рабочай жывёлы па матывах недахвату кармоў. Гэту апартуністычную ўстаноўку апраўдваюць двае старшыня райкалгассаюзу тав. Радзько, які кажа: «Добра робіць, што зараз не абагульваюць. Абагуліць тады, як будзе падножны корм».

Такія разважаньні старшыні райкалгассаюзу павінны спаткаць рашучы адпор з боку кіруючых арганізацый раёну. Коні павінны быць безадкладна абагулены.

Разгортваючы масавы прыліў у калгасы ў часе сяўбы, неабходна арганізацыйна і гаспадарча замацаваць калгасы, чаго зараз няма ў Вузьдзенскім раёне.

П.

Г. Бондар

Штучныя выпасы—

адзін з шляхоў вырашэньня кармавой праблемы

У Нямеччыне, як і ва ўсёй Эўропе, ня гледзячы на інтэнсыўнае вядзеньне сельскай гаспадаркі, адбываецца павялічэньне кармавой плошчы пад сенажацямі і выпасамі. Пры гэтым пад штучныя выпасы ў большасьці выпадкаў адводзяцца ня толькі тыя вучасткі, якія знаходзяцца далёка ад двара, але наадварот лепшыя землі, былыя пад іншымі культурамі, блізкія да сядзібы.

У такіх правінцыях Нямеччыны, як Усходняя Прусія, дзе жывёлагадоўля зьяўляецца асноўнай галіной сельскай гаспадаркі (на гэктар с.-г. плошчы пры падае 1,14 шт. у пераводзе на буйную жывёлу) надзвычай вялікае месца адводзіцца выпасам.

Штучныя выпасы адыгрываюць у Нямеччыне вялікую ролю. У радзе жывёлагадоўчых гаспадарках выпасы займаюць каля 30-40 проц. усёй сельскагаспадарчай плошчы. Утрыманьне жывёлы на выпасах значна танней стойлавага. Акрамя таго, жывёла знаходзіцца ў натуральных умовах і атрымлівае сакавіты корм, які спрыяе лепшаму разьвіцьцю жывёлы і значна ўплывае на павялічэньне прадукцыйнасьці.

Характэрна тое, што якраз пашырэньне плошчы пад штучнымі выпасамі ідзе паралельна з разьвіцьцём жывёлагадоўлі.

Раней выпасы насілі пераменны характар і ўваходзілі ў севазваварот. З часу-ж шырокага ўжываньня штучных угнаеньняў, выпасы набылі сталы характар. Абшарнікі зараз нават ганаравацца тым, што ў іх ёсьць шматгадовыя выпасы.

Практыка штучных выпасаў Нямеччыны ўпэўнена разьбівае думку, што дзе больш інтэнсыўная гаспадарка, там для сельска-гаспадарчая плошча павінна быць занята палявымі культурамі. Такі погляд існуе галоўным чынам у сувязі з нізкай даходнасьцю выпасаў, пры адсутнасьці якога-б там ні было догляду іх. Да канца мінулага стагодзьдзя ўраджай сена з гэктара ў Нямеччыне не перавышаў 30 цэнтнэраў, зараз-жа, калі зьвернута большая ўвага культуры сенажаці і выпасаў, сярэдні збор сена даходзіць да 40 цэнтнэраў, а ў буйных гаспадарках да 50-60 цэнтнэраў. Гэтыя лічбы гаворыць за тое, што гэта галіна гаспадаркі можа весьціся таксама інтэнсыўна, як і другія. Пры чым можна дасягнуць ня толькі павялічэньня колькасьці сена, але і значнага паляпшэньня яго якасьці, спажыўнасьці.

У Нямеччыне за выпасамі наладжаны добры і сыстэматычны догляд. Яны ўгнойваюцца і робіцца падсеў траў. Таму і ня дзіўна, што адзін гэктар выпасу на працягу лета (4-5 м-цаў) можа пракармініць ад 2 да 3 шт. буйной рагатай жывёлы. Узяўшы аловак у рукі, можна падлічыць тое, ці кожная збожжавая культура дасьць магчымасьць з гэктара пракармініць на працягу 150 дзён 2-3 каровы! Робячы падлічэньні атрымліваецца, што выпасы больш выгадны чым нават пасеў збожжавых культур. І гэта ва ўмовах Нямеччыны, дзе ўраджай збожжа ў 2-3 разы вышай за нашы!

Важнейшай умовай атрыманьня высокай даходнасьці ад выпасаў зьяўляецца правільная іх закладка. Пры адводзе плошчы пад штучны выпас трэба ўлічваць глыбіню залягання грунтовых вод. Як устаноўлена практыкай, воды павінны даходзіць ня бліжэй 1,2 мэтра. Пры блізасьці-ж грунтовых вод, перад тым як такія плошчы адвесьці пад выпасы, робіцца мэліярацыя, кладзецца дрэнаж. Перад закладкай штучнага выпасу глеба добра апрацоўваецца і імкнуцца на магчымасьці зьнішчыць сарнякі. Ня менш важным фактарам арганізацыі добраякаснага выпасу зьяўляецца падбор насеньня траў, якія-б адпавядалі клімату даной мясцовасьці і глебавым умовам.

Якім парадкам адбываецца ператварэньне іншых ужыткаў у выпасы? Як гэта ўстаноўлена нямецкай практыкай, на незабалочаных землях гэта робіцца наступным чынам. З восені, плошча, вызначаная пад выпас, глыбока ўзворваецца. Гэта спрыяе лепшаму прамярзаньню на працягу зімы верхніх пластоў і большаму незапашваньню вільгаці.

Раньняй вясной, як толькі прасохне верхні пласт пахаці, пускаецца валакуша, або лёгкія бораны. Гэтай спрацоўкай зьнішчаюцца ўсходы сорных расьлін і ствараецца пажаданая структура глебы. Калі-ж плошча пакрыта вялікай колькасьцю сарнякоў, пажадана пусьціць лушчыльнік. На цяжкіх гліністых глебах рэкамэндуецца здымаць у лушчыльніка адволы і працаваць толькі адными лямешамі, гэта папярэджвае зацьвярдзеньне гліністай глебы. Для таго, каб не стварылася цьвёрдая корка, сьледам за лушчыльнікам пускаюць каток, а потым зноў баруюцца і задзелваецца валакушай.

Апрацоўка мэліяраваных балот і арганізацыя на іх штучных выпасаў робіцца інакш. Спачатку зямлю глыбока ўзворваюць, потым для шчыльненьня пластоў пускаюць цяжкі каток, зроблены спэцыяльна для балотных глеб. Сьледам за катком—баруюць. Для таго, каб пласты не пераварачваліся бораны пускаюць ня ўпоперак, а ўздоўж пахаты. Пасьля такой апрацоўкі на балотных глебах, для зьнішчэньня сарнякоў і балотных расьлін, рэкамэндуецца на працягу 1-2 год сеяць шырокалістыя расьліны на зялёны корм. Канец мая месяца, пасьля таго, як зямля добра нагрэлася, лічыцца лепшым часам для пасеву траў. Меншаніна траў надбіраецца такая, якая-б дала большую зялёную масу і высокую спажыўнасьць.

Цікава прывесьці даныя Усходня-Прускага Інстытуту Жывёлагадоўлі аб тым, якія травы больш каштоўныя па спажыўнасьці. Так, паводле падлікаў Інстытуту, 100 кілёграм сена розных траў пры дачы карове вдольны даць наступную малочную прадукцыю:

	Малака у кг.	Масла у кг.
Матлік ураджайны . .	66,4	2,2
Лісахвост луговы . . .	64,0	2,0
Бэкманія	63,2	1,9
Асака	37,3	1,3

Пасьба жывёлы на выпасах, асабліва на новаарганізаваных, патрабуе захаваньня некаторых правіл. Так, на новы выпас, выганяецца жывёла толькі тады, калі травы добра ўкараніліся і стварылі суцэльны пакроў. Шкодна для выпасу, калі застаюцца глыбокія сьляды жывёлы. У час дажджу, ці адразу-ж пасьля яго, або калі надта вільготная глеба, на новы выпас ня раіцца пускаць жывёлу, каб капытамі не пансаваць травяны пакроў. Трэба таксама сачыць, каб трава не пад'ядалася пад самыя карэньні, бо гэта ў сонечныя дні можа прывесьці да высыханьня расьлін.

Догляд старых выпасаў устаноўлен наступны. Вясной, як толькі адтала зямля, рэкамэндуецца агледзець выпас, ці не засталася дзе вада. Калі засталася, дык трэба зараз-жа спусьціць, а таксама прывесьці ў спраўнасьць мэліярацыйныя пабудовы. Як толькі прасохне верхні пласт, унесьці штучныя ўгнаеньні. Ва Усходняй Прусіі ўгнойваюцца галоўным чынам каліем і фосфарам. Даецца на гэктар 2-3 цэнтнэры 40 проц. калійнай солі і ад 2 да 4 цэнтнэраў тамаслаку. Калі выпас пакрыты мохам, ці сарнякамі—правесьці баранаваньне, або пускаюць валакушу. На заліўных сенажацях угнаеньне ўносіцца або ўвосень, або пасьля спаду вады, а ў некаторых выпадках і пасьля першага ўкосу. Робіцца таксама ваппаваньне сенажацяй і выпасаў. Уносяць ад 20 да 30 цэнтнэраў на гэктар. Гной, кампост ці жыжа на сен

Перабудова дзяржаўнага апарату—

СПРАВА ШЫРОКІХ МАС ПРАЛЕТАРСКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ

ДЭПУТАЦКАЯ ГРУПА НА ПРАДПРЫЕМСТВЕ—ЛЕПШАЯ ФОРМА СУВЯЗІ ГАРСАВЕТУ З ВЫТВОРЧАСЬЦЮ

У ЛЯБАРАТОРЫІ ПА ПЕРАБУДОВЕ САВЕЦКАГА АПАРАТУ

Прапановы працоўных Койданаўшчыны—на абгаварэньне шырокай пралетарскай грамадзкасьці БССР

Брыгада ЦКК НК-РСІ прыступіла да вывучэньня работы савецкага апарату Койданаўшчыны. У гэтай рабоце брыгада сустрэла актыўнае падтрыманьне і дапамогу з боку шырокай пралетарскай грамадзкасьці як у выяўленьні недахопаў у рабоце паасобных устаноў і арганізацый раёну, так і ў напрамку ўнясьненьня прапаноў аб паляпшэньні гэтай работы.

Пераважная большасьць раённых устаноў на сёнешні дзень працуе бесплянава, праводзіць работу паралельна. Некаторыя раённыя ўстановы дагэтуль яшчэ не ўявілі сваіх правоў і абавязкаў пасьля ліквідацыі акруг, не пераключыліся на паляпшэньне абслугоўваньня сельскіх саветаў.

Кіраўніцтва калгасным будаўніцтвам не забясьпечана ў выстарчальнай меры, на гледзячы на наяўнасьць у раёне чатырох устаноў, кіруючых гэтай справай: райза, МТС, райкалгассаюз і райкаапсаюз.

Спажывецкая каапэрацыя засьмечана чужым, клясава-варожым элемэнтам.

Рабочыя і працоўныя Койданаўшчыны ўпесьлі рад прапаноў у напрамку паляпшэньня работы раённых устаноў, перабудовы дзяржаўнага апарату так, каб ён быў здольным выконваць важнейшыя задачы, якія ставяць перад ім партыя і ўрад. На дапамогу брыгадзе вылучана 120 чал. з прадпрыемстваў, ўсталоў і калгасаў Койданаўшчыны.

У прыватнасьці пралетарская грамадзкасьць Койданаўшчыны высунула для абгаварэньня і распрацоўкі ў брыгадзе наступныя пытаньні: зараз у раёне сельскую гаспадарку абслугоўваюць 4 установы: **райземаддзел, райкалгассаюз, МТС і райкаапсаюз** (апошні па арганізацыі першапачатковых вытворчых аб'яднаньняў). Гэтыя арганізацыі ня ўвязваюць сваёй работы, праводзяць яе паралельна і іншы раз даюць нізавым арганізацыям супярэчлівыя адна другой дырэктывы. Грамадзкасьць Койданаўшчыны высоўвае пытаньне аб **сканцэнтраваньні ўсёй работы** па абслугоўваньні сельскай гаспадаркі ў аднэй установе, пры чым апошняя павінна быць пабудавана такім чынам, каб яна магла забясьпечыць поўнасьцю выкананьне задач сацыялістычнай перабудовы вёскі.

Другое пытаньне. Зараз у раёне ёсьць каля 10 устаноў, якія займаюцца забесьпячэньнем і збытам: сыстэма спажывецкай каапэрацыі, райкаапсаюз, хлебсаюз, скурсындыкат, Белмяса і інш. Усе гэтыя арганізацыі праводзяць загатоўкі ўсіх відаў, засыпаюць сельсаветы рознымі часта непатрэбнымі і супярэчлівымі паперкамі. Работа праводзіцца бясплянава, бяз усякага разьмеркаваньня функцый.

Грамадзкасьць Койданаўшчыны высоўвае думку аб мэтазгоднасьці сканцэнтраваньня функцый па забесьпячэньні спажыўцоў прамтаварамі і прадуктамі, забесьпячэньні сельскай гаспадаркі машынамі і с.-г. інвэнтаром, збыце сельска-гаспадарчай прадукцыі і па ўсіх відах загатовак у сыстэме спажывецкай каапэрацыі. За кошт тых сродкаў, якія будуць з'эканомлены ад ліквідацыі лішніх аўтаньняў, а ў сувязі з гэтым і скарачэньня пасылкі ў раён упаўнаважаных з цэнтру, можна будзе ўзмоцніць інструктарска-інспэктарскі апарат раённай спажыўкаапэрацыі і РВК, уцягнуўшы ў гэту работу шырокія пралетарскія і калгасныя масы шляхам арганізацыі сацыялістычнага сумяшчальніцтва і г. д.

Трэцяе пытаньне. Ставіцца пад сумненьне мэтазгоднасьць існаваньня ў раёне адначасова трох устаноў: **райфа, райбанку і райашчадкасы.** Работа ўсіх гэтых устаноў можа быць сканцэнтравана ў аднэй з іх. Гэта дасьць магчымасьць забясьпечыць выразнае і своячасовае кіраўніцтва нізавой сыстэмай у галіне выкананьня фінансавага пляну і своячасовага правядзеньня ўсіх фінансавых мерапрыемстваў.

Вось тыя асноўныя пытаньні, якія зараз займаюць шырокую пралетарскую грамадзкасьць Койданаўшчыны, у сувязі з арганізацыяй вопытна-паказальнай работы ў раёне.

Мы спадзяемся, што грамадзкасьць Койданаўшчыны, прымаючы і далей актыўны ўдзел у работе брыгады НК-РСІ, спаткае жывы водгук з боку пралетарскай грамадзкасьці іншых раёнаў БССР. Трэба шырока абгаварыць высунутыя прапановы, скарыстаць іх для пасьпяховай перабудовы савецкага апарату.

Брыгадзір НК-РСІ **РАБЦЭВІЧ.**

Ад рэдакцыі. Прапановы аб ліквідацыі раду зьвеньняў у сыстэме савецкага апарату Койданаўскага раёну друкуюцца ў парадку абгаварэньня.

Глушыцеляў самакрытыкі—да адказнасьці

Работніца Менскай абутковай фабрыкі тав. **Падехіна** была вылучана на кіруючую савецкую работу і выбрана **старшынёю Заслаўскага местачковага савету.** Ня гледзячы на сваю малапісьменнасьць і на тое, што яна ніколі ня была на адказнай савецкай рабоце, тав. Пацехіна вельмі добра спраўлялася са сваімі абавязкамі і вяла рашучую барацьбу за выкананьне гаспадарча-палітычных задач, за пасьпяховае правядзеньне ўсіх кампаній.

У выніку адданай працы тав. Пацехінай былі ліквідаваны прарывы на спагнаньні сельгаспадатку і страхоўцы, рэалізацыі пазыкі, загатоўках збожжа, бульбы і г.д. Рэвізыя работы местачковага савету паказала, што работніца-выдзвіжэнка тав. Пацехіна поўнасьцю апраўдвае сябе на савецкай рабоце. Пленум савету, які адбыўся ў сакавіку, таксама адзначыў, што тав. Пацехіна добра праявіла сябе на рабоце і поўнасьцю апраўдвае сябе, як вылучэнка. І ўсё-ж нядаўна тав. Пацехіна... **была зьнята з працы.**

Чым-жа тлумачыцца гэты аўдны факт? Аказваецца, уся справа—у недалюбліваньні самакрытыкі з боку асобных раённых кіруючых работнікаў. Тав. Пацехіна на партыйных сходах выступала ў жорсткую крытыкай раённых работнікаў, паказвала на абураючыя факты самазабесьпячэньня з боку раду работнікаў, на ненармальнасьці з выдачай пайкоў і г. д.

Пасьля гэтага... была задаволена заява тав. Пацехінай аб вызваленьні яе ад работы ў савеце. Раённыя арганізацыі не дапаматалі тав. Пацехінай у яе рабоце. Давялі сказаць, што на працягу двух месяцаў у савеце нават ня было сакратара і на малапісьменную работніцу—вылучэнку фактычна была звалена ўся тэхнічная работа.

Мы лічым факты «вызваленьня» тав. Пацехінай з работы аўдным запісам самакрытыкі з боку заслаўскіх раённых работнікаў, жаданьнем вызваліцца ад заплата «разьвязнай» вылучэнкі. ЦКК КП(б)Б павінна сказаць сваё важнае слова па гэтай справе.

ПЯРО.

Аб шэфстве над савецкім апаратам і ня думаюць

ШКЛОЎ. (Наш кар.).

У Шклове шэфства рабочых над савецкім апаратам зусім не наладжана. На фабрыцы **«Спартак»** налічваецца 800 рабочых, але да гэтага часу пытаньне шэфства ніколі нават ня ўзьнімалася. Фабрычныя арганізацыі зусім ня цікавяцца гэтай справай.

Ян.

Слуцкі гарсавет не павярнуўся тварам да вытворчасьці

СЛУЦАК. (Наш кар.). Слуцкі гарсавет усё яшчэ не павярнуўся тварам да вытворчасьці, да прамфінпляну. Да гэтага часу гарсавет не наладзіў жывой сыстэматычнай сувязі з прадпрыемствамі. Работа з дэпутатамі на прадпрыемствах не праводзіцца. Дэпутацкія групы не арганізаваны.

Гарсавет павінен неадкладна выправіць сваю памылку. Трэба ў бліжэйшы час арганізаваць дэпутацкія групы на прадпрыемствах і разгарнуць шырокую работу з імі.

Я. Ж.

Жыльлёвае будаўніцтва

Новы дом—камуна ў г. Віцебску

Менск будуецца...

3 млн. р.—на жыльлёвае будаўніцтва.—Новая электрастанцыя.—Парк культуры і адпачынку

У бягучым будаўнічым сэзоне па Менску будуць праведзены вялікія работы па паляпшэньні дабрабыту гораду і па жыльлёвым будаўніцтве.

На жыльлёвае будаўніцтва на працягу сэзону будзе выдаткавана 3 млн. руб. Вядоме пляну, навінна быць пабудавана ня менш 800 кватэр, у тым ліку 250 для вайсковых служачых. Яшчэ да жніўня павінна быць скончана пабудова 150 драўляных кватэр лёгкага тыпу ў рабочых раёнах.

Рад устаноў пераводзіцца ў іншыя гарады, частка іх пераводзіцца на работу ў 2 зьмены. Гэта мерапрыемства дасьць каля 700 кватэр.

Існуючая сыстэма жылкаапэрацыі рэарганізуецца. ЖАКТы будуць прымацаваны да паасобных прадпрыемстваў і ўстаноў. Праводзіцца таксама разубуйненьне ЖАКТ'аў.

У мэтах належнага ўтрыманьня і своячасовага рамонту наяўнага жыльлёвага фонду ў бліжэйшы час арганізуецца спэцыяльная рамонтная кантора.

Паколькі існуючая электра-станцыя ня можа забясьпечыць патрэбы гораду ў электраэнэргіі і пачынаецца пабудова новай магутнай электрастанцыі, якая зможа задаволіць усе ўзрастаючыя патрэбы гораду і прамысловасьці.

У канцы гэтага году будзе пабудавана і далучана да гораду новая водная станцыя у Навінках. Пуск станцыі значна палепшыць становішча з забесьпячэньнем гораду вадой.

У бліжэйшы час будзе прыступлена да пабудовы новай трамвайнай лініі на Ляхаўцы. Лік трамвайных вагонаў у гэтым годзе павінен быць павялічаны да 35.

Транспартнаму трэсту даручана ў месячны тэрмін адрамантаваць усе аўтобусы, якія зараз не скарыстоўваюцца. Аўтобусы будуць пушчаны для сувязі з прыгароднымі сельсаветамі і ваколіцамі гораду, дзе няма трамвайнай лініі. Усяго будзе пушчана 13 аўтобусаў.

Вялікая работа праводзіцца ў бягучым годзе ў галіне культурнага будаўніцтва. У раёне выстаўкі будзе адкрыты парк культуры і адпачынку. Парк павінен быць адкрыты не пазьней 1-га ліпеня.

Шмат увагі аддаецца пашырэньню зяленых насажэньняў. Камгасу прапанавана не пазьней 1-га чэрвеня насадзіць яшчэ адзін сквэр паміж Ленінскай і Камсамольскай вуліцам, і прывесьці ў парадак існуючыя сквэры, насадзіць ня менш 600 новых дрэў па вуліцах гораду.

Брук і тратуары гораду ня толькі на акраінах, але нават і ў цэнтры на сёнешні дзень знаходзяцца ў вельмі дрэнным становішчы. У бягучым годзе будуць забрукаваны: Ленінская вуліца ад пляцу Волі да Савецкай і Савецкая ад рагу Ленінскай да Луначарскай брушчаткай, вуліца Карла Маркса—клінкерам. Апрача таго намечана забрукаваць рад вуліц каменьнем. Уся работа па брукаваньні вуліц павінна быць скончана не пазьней лістапада.

У гэтым годзе павінны быць пабудаваны буйная лазьня і новая мэханізаваная пральня.

Забесьпячэньне горада вадой і электраэнэргіяй

На Эльводзе ідзе энэргічная работа па канчатковай ліквідацыі вынікаў паводкі. Дагэтуль яшчэ ня пушчан ангельскі турба-генэратар, які сушыцца. У бліжэйшыя дні будуць пушчаны помпы студні, якая знаходзіцца ў гарадзкім садзе і студні другога ўздыму. Пуск гэтых двух помпаў дасьць дадаткова 8 тыс. вёдзер вады.

Трэба падкрэсьліць, што поўнае аднаўленьне работы Эльводу не забясьпечвае задавальненьня ўсё узрастаючых патрэб гораду і прамысловасьці ў электраэнэргіі і будаўніцтва—у вадзе.

Таму вялікае значэньне набывае своячасовы пачатак будаўніцтва электрастанцыі. Зараз павінна быць пачата будаўніцтва новай моцнай скважыны ў Навінках. Дагэтуль скважыну нельга ўключыць у агульную водаправодную сетку, бо Дзяржплян не прадугледзеў, што для пабудовы скважыны патрэбны матар'ялы і трубы. Паводле пляну работы павінны быць скончаны да 20 чэрвеня. Аднак, дагэтуль да працы амаль ня прыступлена, бо няма ні труб, ні лесаматар'ялаў, ні гатункавага жалеза. Належным органам трэба зацікавіцца гэтай справай. Між іншым Белжылсаюз мае трубы і іншыя матар'ялы, якія ляжаць бяз руху, частку іх можна і трэба перадаць Эльводу.

Май—рашаючы месяц лову

БАРАЦЬБА ЗА 50.000 ЦЭНТН. РЫБЫ—БАЯВАЯ ЗАДАЧА УСІХ РЫБАКОЎ, УСІХ РЫБАЗАГАТОЎЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ. НІ АДНАГО ЦЭНТНЭРА РЫБЫ НА ПРЫВАТНЫ РЫНАК

ВЕСНАВЫ ЛОЎ--НА ЎДАРНЫЯ ТЭМПЫ!

Разгарнуць сацспаборніцтва на лове

Лоў за апошнюю дэкаду красавіка даў усяго каля 700 цэнт. рыбы. Першыя дзьве дэкады красавіка далі яшчэ менш (каля 450 цэнт. у першай дэкадзе і 520 ў другой).

Рыбныя вучасткі зусім дрэнна выканалі месячнае заданьне. Найвышэйшы процант ажыцьцяўленьня месячнага заданьня—гэта 36,2 проц. (ПОЛАЦКІ вучастак). 34,3 проц. даў Віцебскі вучастак. На іншых—зусім дрэнныя паказьнікі. Магілеўскі вучастак выканаў 9,9 проц. месячнага заданьня, Аршанскі 16,6 проц., Бабруйскі—17,3 проц. Гомельскі—18,6 проц., Менскі—21,1 проц. і Мазырскі—26,7 проц.

Такое становішча лову прымушае сыгналізаваць трывогу. Работнікі Белрыбаксаюзу, імкнучыся апраўдаць прарывы, спасылаюцца на паводку, якая, быццам, перашкодзіла лову. Праўда, паводка тармозіла лоў; самы буйны рыбны вучастак—МАЗЫРСКІ—зусім ня меў магчымасьці разгарнуць пуціну, але паводка працягвалася толькі адну дэкаду, ня больш. Між тым, першыя дзьве дэкады далі горшыя вынікі, чым апошняя. Чым гэта тлумачыцца, паважаныя таварышы з Белрыбаксаюзу?

Невыкананьне месячнага пляну адбілася і на ажыцьцяўленьні гадавога заданьня. Паводле вестак на 1-га мая, гадавое заданьне выканана на 20 проц. Перадавымі зьяўляецца Мазырскі вучастак—34,1 проц. і Полацкі,—29,4 проц.

Прычыны прарываў у лове—не ва ўплыве стыхіі, а ў няўменьні арганізаваць кампанію, праводзіць яе ударнымі тэмпамі, разгарнуць сацспаборніцтва на лове. Паводле вестак Белрыбаксаюзу, 64 рыбацкія аб'яднаньні ўступілі ў сацспаборніцтва, ахоплена спаборніцтвам 1.412 рыбакоў. Ёсьць 302 ударнікі-рыбаловы. На жаль, гэтыя лічбы ва многім не адпавядаюць сапраўднасьці. Белрыбаксаюз улічвае і тыя арцелі, якія ўступілі ў спаборніцтва, і тыя, каго выклікалі. Калі арцель выклікала другую арцель, дык хоць апошняя на выклік не адказала, Белрыбаксаюз залічвае яе ў грамадзкі ўдзел у сацспаборніцтве». Ня гледзячы на рад сыгналаў «Зьвязды» аб тым, што Белрыбаксаюз нічога ня робіць для ўцягненьня рыбакоў у калгасы, дагэтуль мала што ўжыта. Белрыбаксаюз ведае, што Пухавіцкая арцель поўнасьцю ўступіла ў калгас. А больш? Здаецца, што «яшчэ некаторыя ўступілі»—адказваюць у Белрыбаксаюзе.

Трэба адзначыць наступны факт: калі на першым усебеларускім зьезьдзе рыбацкай каапэрацыі зацьвярджалася гадавое заданьне па лове—46.000 цэнт. рыбы, дык дэлегаты зьезду прапанавалі павялічыць гэта заданьне да 50.000 цэнт. Прычым было агаворана, што гэта павялічэньне ідзе не ў парадку сустрэчнага пляну, бо пляны высоўваюцца паасобнымі арцелямі, а ў парадку простага павялічэньне кантрольнай лічбы. Зьезд прыняў гэту пастанову. Зараз пасьля прарываў у зімовым лове і веснавой путіне праўленьне Белрыбаксаюзу вядзе заданьня, а рэшту—4.000 цэнтн. разглядае, як сустрэчны плян.

Па спробах зьнізіць пляны лову—ба бязьлітасна ўдарыць, бо гэта—ўхіл апартуністычнага нявер'я ў рэальнасьць нашых пляноў.

Нядаўна пачалася чыстка арцеляў ад чужых элемэнтаў. Ужо скончылася праверка загорынскай групы Мазырскага вучастку. Вычышчаны атаман групы ЛУК'ЯНОВІЧ—за сыстэматычнае пянства, нявыхад на работу, за ўдзел у продажы на прыватным рынку сяўры, выдаючы на прыватным рынку сяўры, вызначаны для прэміяваньня; член арцелі ЮРКЕВІЧ—за незаконнае прысваеньне 30 клг. першагатункоўай рыбы, за ўдзел у продажы сяўры. Справа перададзена на сьледчым органам. Абвешчана сурова вымова рыбаку Ражку за зьмазваньне адмоўных фактаў работы арцелі.

Бліжэйшыя задачы — АЧЫСЬЦІЦЬ АРЦЕЛІ АД КУЛАЦКІХ І ЧУЖЫХ ЭЛЕМЭНТАЎ, РАЗГАРНУЦЬ САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА НА ЛОВЕ, ПЕРАВЫКАНАЦЬ НА ПРАЦЯГУ МАЯ МЕСЯЧНЫ ПЛЯН ЛОВУ І НАВЯРСТАЦЬ УПУШЧАНАЕ ЗА МІНУЛЫ МЕСЯЦ.

Трэба аддаць увагу спагнаньню ацэнкі гадых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак, даючы адпор усялякім спробам патураньня кулаку.

Ц.-С.

7.000 цэнт. рыбы могуць даць дробныя вадаёмы,

якія зараз не скарыстоўваюцца

Рыбазагатоўчыя арганізацыі БССР атрымалі ў гэтым годзе ўдарнае заданьне даць рабочым цэнтрам максымальную колькасьць рыбнай прадукцыі. Рыбацкія арцелі БССР павінны вылавіць каля 50.000 цэнт. рыбы. Белрыба і Рыбаксаюз павінны так кіраваць і арганізоўваць работу, каб ударнае заданьне гэтага году было поўнасьцю ажыцьцёўлена. Аднак, дагэтуль пляны ўлову выконваюцца падзвычай дрэнна. У той час, калі першы квартал павінен быў даць ня менш 40 проц. гадовага пляну, ён даў каля 17 проц.

Таму трэба аддаць максымум увагі пытаньню скарыстаньня ўсіх магчымасьцяй для павялічэньня лову. Зараз арцелі Рыбаксаюзу скарыстоўваюць найбольш каштоўныя вадаёмы, а тыя вадаёмы, якія даюць невялікія ўловы, зусім не аблаўляюцца.

Паводле вестак Белрыбаксаюзу, на тэрыторыі 32 раёнаў БССР вадаёмы зусім не скарыстоўваюцца з прычыны таго, што яны маюць малае значэньне ў рыбнай гаспадарцы, што яны знаходзяцца далёка ад чыгункі. Між тым, гэдавы плян лову рыбы разьлічан на аблаў самых другарадных вадаёмаў. Вадаёмы, якія зараз знаходзяцца па-за ўвагай рыбных арцеляй, павінны ле самых скромных падлікаў, могуць даць у год ня менш 7.000 цэнт. рыбы. Гэта вялікая колькасьць рыбнай прадукцыі ня трапіць да рабочага стала жыўца, бо фактычна ў 32 раёнах шырока практыкуецца незаконны лоў рыбы, якая ідзе на прыватны рынак і прадаецца па спэкуляцыйных цэнах.

Неабходна пераключыцца на абслугоўваньне самых другарадных вадаёмаў. Трэба шляхам кантрактацыі рыбы ў рыбакоў-адзіночак ахапіць поўнасьцю ўсе вадаёмы БССР.

Калі з-за далёкай адлегласьці вадаёмаў ад чыгункі немагчыма будзе адпраўляць рыбу ў прамысловыя цэнтры, можна здаваць рыбы ў месцовыя спажывецкія таварыствы, якія адна ведна зьменяць завод рыба-прадуктаў.

К.

Лепшы рыбны вучастак

МАЗЫР. (НАШ КАР.). НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ ПА ВЫКАНАНЬНІ ПЛЯНУ ЎЛОВУ РЫБЫ Ў ПЕРШЫМ КВАРТАЛЕ ІДЗЕ МАЗЫРСКІ ВУЧАСТАК БЕЛРЫБАКСАЮЗУ, ЯКІ ПЕРАВЫКАНАЎ ГАДАВЫ ПЛЯН НА 31 ПРОЦ.

МІХНЕЎСКАЯ БРЫГАДА МАЗЫРСКАЙ АРЦЕЛІ ПЕРАВЫКАНАЛА КВАРТАЛЬНЫ ПЛЯН НА 20 ПРОЦ.; ПУХАВІЦКАЯ АРЦЕЛЬ — НА 16 ПРОЦ., ПЕШКАЎСКАЯ БРЫГАДА ДЗЕРНАЎСКАЙ АРЦЕЛІ І БАРБАРОЎСКАЯ БРЫГАДА ВЫКАНАЛІ 110 ПРОЦ. КВАРТАЛЬНАГА ЗАДАНЬНЯ.

ПРАЎЛЕНЬНЕ БЕЛРЫБАКСАЮЗУ ПАСТАНАВІЛА ПРЭМІЯВАЦЬ ГЭТЫЯ АРЦЕЛІ І БРЫГАДЫ ЗА ЛЕПШУЮ РАБОТУ ПА ЛОВЕ І ПЕРАВЫКАНАНЬНІ КВАРТАЛЬНЫХ ПЛЯНАЎ НА 1.000 РУБ. ПРАМТАВАРАМІ.

Тара для рыбы прыдумана шкоднікамі

МАЗЫР. (Наш кар.). У красавіку ... у адрас пухавіцкай рыбнай арцелі «Новы», функцыі якой зараз перадана калгасу імя Сталіна ў Жыткавіцкім раёне, прыбыла 7 вагонаў лазовых кошыкаў для ўпакоўкі рыбы. Нікалай ... такіх кошыкаў прыбыла на ст. Мазыр і ў адрас прыпадкага рыбагуртка. Ужо кошыкі аказаліся непрыдатнымі для ўпакоўкі рыбы. Калі адпраўляць у іх рыбу, яна будзе гніць, бо кошыкі ... высокія, яёд у іх будзе гніць, бо ... рысьці для рыбы.

Хто ў рэчаіскім, будзе-кашыцкім, навабеліцкім райпрамкамбінатах прыдумаў такую форму тары? Пракуратура-... на зацікавіцца гэтай справай.

Узнагарода работнікаў міліцыі за гэрайчную барацьбу з паводкай

У часе паводкі ў Менску работнікі міліцыі разам з рабочай клясай і чырвонаармейскімі часьцямі праявілі надзвычайную энэргію, актыўнасьць і адвагу па ратаваньні насельніцтва і маемасьці з затопленых раёнаў.

Менскі гарадзкі савет, адзначаючы вытрыманасьць, адвагу і агуртаванасьць міліцэйскіх радоў, узнагарадзіў выдачай грашовай кампэнсацыі і грамотамі наступных работнікаў міліцыі: Маліноўскага, Савіча, Далідчыка, Вальковіча, Юроніка, Сяргеева, Доўмата, Вашкевіча, Хадасоўскага, Штанюка, Андрушкевіча, Шапалава, Шэпеста, Бокоўскага, Амбражэя, Сяньковіча, Фоміковіча, Грамовіча, Бортніка, Высоцкага, Гадлеўскага, Чорнаусава, Ждановіча, Кудзінава, Беразвіцавіча, Курганскага, Яўменчыка, Гарасімава і Трыгабовіча.

Абвешчана падзяка і ўдзячнасьць таксама т. т. Кручкову, Кохану, Барысенку, Райхлінавічу, Хаданову, Дубаву, Дзегаленку, Ашуйка, Бурцаву, Цішкевічу, Буцько, Грыбу, Шкаеру, Івашкеву, Шаблоўскаму.

На дапамогу пацярпеўшым ад зямлятрасеньня

ХТО НАСТУПНЫ

— Калектыў супрацоўнікаў праўленьня БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА ўносіць 180 РУБ. у фонд дапамогі пацярпеўшым ад зямлятрасеньня ў Савецкай Арменіі.

Калектыў выклікае рабочых і служачых друкарні імя Сталіна, аддзяленьне ГІЗ РСФСР і Цэнтравыдавецтва.

* *

Агульны сход супрацоўнікаў САКРАТАРЫЯТУ ПРЭЗЫДЫУМУ ГАРСАВЕТУ І ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ УЗАЕМАДАПАМОГІ ўносіць на дапамогу пацярпеўшым ад зямлятрасеньня ў Нахічаванскай ССР 74 РУБ. і выклікае калектывы работнікаў Гарфа, Камгасу і Гарза.

* *

Супрацоўнікі БЕЛІЛЬНАСАЮЗУ і БЕЛСАДГАРОДСАЮЗУ на агульным сходзе пастанавілі арганізаваць збор сродкаў па падпісным лісьце ў дапамогу пацярпеўшым ад зямлятрасеньня ў Закаўказкай СФСР. Сход выклікаў мясцовымі наступных установаў: НАРКОМЗЕМ, БЕЛКАЛГАСЦЭНТР, БЕЛДЗЯРСНАБ, БЕЛСАДГАРОДНІНА, БЕЛЖЫВСАЮЗ і БЕЛКААПСАЮЗ.

Паведамленьні

— 10 мая, у 5-я пал. гада, тэ... род. корп. ВДУ, аўд. № 1, т-ва ... стаў-літаратуразнаўцаў разам з ... ная сэкцыяй БелАПП'у і інстытутам літаратуры і мастацтва ВАН адкрыцьцё на дыскусія на тэму: «Сучасны этап ... ксьцкага літаратуразнаўства». Ужо ... слова т. Гальперыпаў. Уваход ...

— 10 мая, у 5 гадз. дня, у ... фізічнага корпусу (Замкавая ...) адбудзецца пасяджэньне фізіка-... ная асацыацыі. У парадку дня — ... клад т. Усьпенскага на тэму: «... электрона».

Беларускі Другі Дзяржаўны Тэатр
9 МАЯ паказ для чырвон ай арміі Пач. у 9 гадз. | І. Гурскі КАЧАГАРЫ п'еса ў 4 дзеях.

„Чырв. Зорка" Пач. 7, 8-45 і 10-30 | с 9 мая (ам.фільм) У апошнюю хвіліну (ПЛЫВІ, ДЗЯЎЧЫНА ПЛЫВІ)
„Культура" | З 3-V па 9-V СУСЬВЕТНАЕ ІМЯ Пач. сеансаў: 7, 8-45, 10-30.
„Інтэрнацыянал" | З 5 мая замежны фільм ШЛЮБ аб ЗАКЛАД Пач. 1 с. у 6 г. Каса—з 4 г. 30 м.
„Гігантары" | Мастацкі фільм. САЛІСТКА ЯГО ВЯЛІКАСЬЦІ Драма ў 7 частках.
„Юны Піянэр" Пач. з 1 г. дня. | З 6 МАЯ ўсходні фільм АЛІМ Кіно-аповесьць у 7 частках.
„СПАРТАК", Пач. 6-30, 8 і 9-30 Каса—з 6 гадз. | З 2 па 10 мая выдатны фільм АДЗІН З ДВАЦЦАЦІ Драма ў 7 частках.

10 мая ў 7 гадз. увечары ў памяшк. клюбу К. Маркса Гаркомам КП(б)Б, Гарпрафсаветам і Газбюро СКЛІКАЕЦЦА
агульна-гарадзкая канфэрэнцыя
З ПАРАДКАМ ДНЯ:
1. Сацыялістычнае будаўніцтва і задачы друку.
2. Суданлад і газбюро.
3. Ваенная мастацкая частка.
Яўка наступных т. т. абавязкова: ўпаўнаважаных па друку ячэек КП(б)Б і партклетыраў, ячэек КСМ, культпрацаўнікоў і культкамісій фабрычных камітэтаў і мясцкомаў, рэдкалегій насьценных газэт і шматтыражак, рабкораў і ударнікаў.
Запрашаюцца прадстаўнікі рэдакцый цэнтральных газэт і выдавецтваў, сакратары партячэек і чытачы партыйна-камсамольскай друку.
Білеты атрымаць у культпропе Гаркому.
Менгарком КП(б)Б.
Гарпрафсавет.
496. Газбюро.

СЁНЬНЯ, 9 мая у 7 гадз. веч. у памяшканьні клюбу навуковых працаўнікоў адбудзецца
аб'яднанае пасяджэньне прэзыдыуму БЕЛТАРНІТСА і рэдакцыі „Зьвязды"
ПА ПЫТАНЬНІ
аб паходзе за тэхнікай
Павінны прысутнічаць т. т. Вальфсон, Гершэльман, Кроль, Васюціноскі, Пілатовіч, Наўменкан, Таньцянак, Левінтова

Усебеларуская канфэрэнцыя
т-ва садзейнасьці рацыяналізацыі, вучоту і справаздачнасьці („ОРУ")
адкрываецца 15 мая ў 7 гадз. вечара
Усе раённыя і гарадзкія арганізацыі „ОРУ" павінны да гэтага тэрміну камандыраваць выбраных імі далегатаў.
За атрыманьнем мандатаў і даведак зварачацца ў канцылярыю „ОРУ" (Савецкая, 55, уваход са двара).
502

БЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА
ЎСЕСАЮЗНАГА ТЭКСТЫЛЬНАГА АБ'ЯДНАЧЬНЯ
„СБЫТТЕКСТИЛЬ"
даводзіць да ведама ўсёй клієнтуры, што з 10-V—31 г.
кантора ліквідуецца.
Далейшае забесьпячэньне і фонды пераданы Белдзяржнабу, куды і павінны зварачацца па ўсіх пытаньнях забесьпячэньня.
Наложчыя сумы „СБЫТТЕКСТИЛЮ" паралічваць у Маскве, тэкстыльнае аб'яднаньне Дзяржбанку.
Кіраўнік канторы НАЙСМАН.
4 97

ПАТРЭБЕН
адміністрацыйна-гаспадарчаму кіраўніцтву Універсытэцкага Гарадка
Інжынэр-будаўнік,
знаёмы з цэнтратэхнікай і вентыляцыяй.
—) АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ. (—
Перагаворы аб умовах работы і аплаты з 9 да 11 і з 2 да 5 гадз.
503

БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ
ЎСЕСАЮЗНАГА АКЦЫЯНЭРНАГА ТАВАРЫСТВА
„СЕЛЬХОЗСНАБЖЕНИЕ"
даводзіць да ведама, што на падставе пастановы СНК СССР ад 16-IV—31 г. «Сельхозснабжением»
ВЫПУСКАЮЦЦА АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ на СУМУ 50.000.000 руб.
Абавязацельствы даюць права набыўцом іх на атрыманьне з наяўнасьці на складах забесьпячальных арганізацый або па спэцыяльным заказе дэфіцытных сельска-гаспадарчых машын, абсталаваньня і тэхнічных матар'ялаў, згодна асобнай намэнклятуры, у разьмеры трохкратнай каштоўнасьці набытых абавязацельстваў з правам карыстаньня на дзьве трэці кошту машын крэдытам па шкале крэдытаваньня.
Абавязацельствы могуць набываць калгасы, нізавыя вытворчыя каапэрацыйныя аб'яднаньні і адзасобныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі.
Выдачы машын, абсталаваньня і тэхнічных матар'ялаў набыўцом абавязацельстваў пачнецца з 1-га кастрычніка 1931 году.
У раёнах, у якіх у 1932 годзе арганізуюцца машына-трактарныя станцыі абавязацельствы будуць прымацца ў аплату акцый Трактарацэнтру.
Разьмяшчэньне абавязацельстваў будзе праводзіцца на працягу красавіка, мая і чэрвеня месяцаў 1931 г.
Абавязацельствы выпускаюцца каштоўнасьцю ў 10, 25, 50 і 100 р.
ПАДПІСКА на абавязацельствы прымаецца: 1) філіяламі Дзяржбанку, 2) ашчадкамі касамі, 3) усімі райкалгассаюзу, нізавымі вытворчымі аб'яднаньнямі, 4) міжраённымі складамі, базамі „СЕЛЬХОЗСНАБЖЕНИЕ" у г. г. Віцебску, Воршы, Гомелі і Менску.
Беларускае аддзяленьне «СЕЛЬХОЗСНАБЖЕНИЯ».

ЛІКВІДАЦЫЙНАЯ КАМІСІЯ
Беларускага камітэту саюзу рабочых-мэталістаў
даводзіць да ведама арганізацый і ўстаноў, што ў сувязі з ліквідацыяй саюзу,
ПРЭТЭНЗІІ—грашовыя і інш.
павінны быць прад'яўлены ў камісію да 12 мая г. г. па адрасе: Менск, Дом Працы, 3 паверх, пакой 16.
Пасьля гэтага тэрміну ніякія прэтэнзіі здавальняцца ня будуць.
ЛІКВІДКОМ.

МЯНЯЮ
пакой у ГОМЕЛІ ў цэнтры гораду на пакой у МЕНСКУ. Даведацца: Менск, вул. Карла Маркса, новы інтэрнат Камвузу, пакой № 41 Н. Я. Кручкову, або: Гомель, вул. Жаркоўскага, Б. Сорціна.
490

ПРАПАЛА
сургучная пячатка Бел. камітэту ЦК на справах эвакуацыі грантаў.
ЛІЧЫЦЬ НЕСПРАЎДНАЙ

ЗГУБЛЕНЫ рахунак № 304 ад 30-XI-30 г. на суму 677 р. 85 к. з нарадамі на перевозку розных будаўнічых матар'ялаў, выд. «Саюзтрансам» на імя арцелі «Чырвоны Транспарцінк» за №№: 1) 897-а ад 5-XI, 2) 891 ад 8-XI, 3) 5520, 5521, 5522, 5519 ад 6-X, 4) 2651 ад 4-XI, 5) 2450 ад 5-XI, 6) 1380 ад 31-X, 7) 2115 ад 31-X, 8) 21 328 ад 10-XI, 9) 3861 ад 17-XI, 10) 12448 ад 4-XI. Лічыць несапраўднымі.

Да адказнасьці за псаваньне малака

За апошні час на малочны завод пачало паступаць малако ў папсаваным выглядзе (кіслым). Асноўная прычына гэтага зьявішча нядбайныя адносіны з боку работнікаў па дастаўцы малака. Замест 7-8 гадзін раніцы малако дастаўляецца ад 11 да 2 гадзін дня. Малако вячэрніх удояў не астуджваецца, халадзільнікі, якія ёсьць на мясцох, не скарыстоўваюцца. Пры адпраўцы на завод бэтоны з малаком закрываюцца чым папала, брудными трапкамі, саломай і г. д. Усё гэта, бязумоўна дрэнна адбіваецца на якасьці малака.

Саўгасы Белсельтрэсту і фэрмы МІРК нічога ня робяць для арганізацыі своячасовай дастаўкі малака на завод. Саўгас **«Новы сьвет»**, які знаходзіцца на тэрыторыі былой выстаўкі, дастаўляе малако у 5 гада. дня. Саўгас **Прылукі**—у 2